Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 САКАВІКА 2018 г. СЕРАДА № 46 (28662)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Са святам, дзяўчаты!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сямікласніцы мінскай гімназіі № 24 Дар'я ХМЯЛЕЎСКАЯ, Ульяна ФЕДАРЭНСКАЯ і Яна СІРОТКА.

ВЫ РОБІЦЕ ЖЫЦЦЁ ПРЫГАЖЭЙШЫМ

Дарагія суайчынніцы!

Сардэчна віншую вас з Днём жанчын.

8 Сакавіка — адно з самых выдатных свят, бо яно напоўнена цёплымі словамі, шчырымі ўсмешкамі і вясновым настроем.

Менавіта вы, дарагія жанчыны, увасабляеце сабой прыродную прыгажосць, каханне і пяшчоту. Мы ўдзячныя вам за мудрасць і клопат у выхаванні дзяцей і моладзі, за энергічнасць і працавітасць, за ўменне ствараць утульнасць, парадак і гармонію ў доме. Вашы жаноцкасць і чароўнасць робяць наша жыццё ярчэйшым і прыгажэйшым.

Няхай у вас будзе як мага менш трывог і засмучэнняў, а шчасце і ўдача спадарожнічаюць вам заўсёды. Ад усёй душы жадаю моцнага здароўя, міру і дабра.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ШАРСНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:

«Нераўнамернае развіццё рэгіёнаў уплывае на якасць жыцця людзей, і таму сітуацыю неабходна выраўноўваць. Адзін з дзейсных механізмаў — прыцягненне інвестараў. Пакуль у краіне самая высокая канцэнтрацыя прадпрымальных людзей у сталічным рэгіёне. На жаль, не вельмі хочуць бізнесмены ісці на перыферыю і развіваць там вытворчасць. У іх на тое ёсць свае падставы і цэлы шэраг аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын. Задача мясцовых і цэнтральных улад — дзейнічаючы ўзгоднена, ствараць у рэгіёнах прывабныя ўмовы для малога і буйнога бізнесу, айчыннага і замежнага. Дарэчы, у Віцебскай вобласці ўжо ёсць удалыя прыклады прыцягнення значных інвестыцый».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 2°
Віцебск	- 1°
Гомель	- 1°
Гродна	0°
Магілёў	- 2°
Мінск	- 1°

■ Круглы стол

СЯМ'Я — ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ШЧАСЦЕ

Сучасныя жанчыны становяцца ўсё больш незалежнымі, а мужчыны — больш эмацыянальнымі. Узрост для вяселля, як і час для нараджэння дзяцей, з кожным годам павышаецца. А некаторыя дзесяцігоддзямі жывуць без «штампа», не думаючы пра наступствы. Паняцці сям'і, шлюбу і кахання настолькі змяніліся, што спецыялісты заклікаюць стварыць новыя законы, якія юрыдычна абаранялі б адносіны па-за межамі шлюбу. Не пашкодзіў бы і асобны дэпартамент сям'і, дзе займаліся б усімі пытаннямі, з якімі сутыкаюцца муж і жонка. Што такое грамадзянскі шлюб насамрэч, у якім становішчы аказваюцца мужчына і жанчына, калі яны не распісаны, чаму перапоўнены рэпрадукцыйныя цэнтры і да чаго трэба імкнуцца ў сям'і?.. Падчас круглага стала «Сям'я — гэта не толькі шчасце», які прайшоў у рэдакцыі газеты «Звязда», эксперты абмяркоўвалі існуючыя рэаліі і разважалі, чаго прагнуць сучасныя сем'і.

СТАР. 8-9

■ Нестандартны падыход

ЗВАРШЧЫК, СЛЕДЧЫ, АЎТАІНСТРУКТАР

Гісторыя беларусак з «нежаночымі» прафесіямі

Ахова здароўя, сацыяльныя паслугі, адукацыя, гандаль, творчасць — у гэтых сферах найчасцей працуюць жанчыны. Але практыка паказвае, што нашым дамам пад сілу амаль любая работа. Яны вараць метал і рамантуюць ручкі ў дзвярах, расследуюць асабліва цяжкія крымінальныя справы і дапытваюць злачынцаў, вучаць ваджэнню і стартуюць першыя на святлафоры. Беларускі з «нежаночымі» прафесіямі расказваюць, як праходзяць іх будні, ці лёгка прабіваць сабе дарогу сярод мужчын, якія знакі ўвагі любяць і якой мусіць быць сапраўдная жанчына.

«Не дазваляю мужчынам працаваць за мяне»

Надзея КАНАКОВА выдатна варыць не толькі баршчы, але і метал. Шосты год яна працуе **зваршчыкам на Дзяржынскім эксперыментальна-механічным заводзе,** дзе робіць каркасы для аўтобусаў. Мяняць прафесію жанчына не збіраецца.

— Пайсці прадаўцом? Ну, не маё гэта. А тут падабаецца, і ўсё. Люблю фізічную працу: мне трэба некуды дзяваць энергію, цягаць што-небудзь... Нехта, можа, падумае, што хлушу, але я з задавальненнем іду на работу і выконваю яе на «выдатна».

СТАР. 5

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ПАЛАЦ ДЛЯ ГРАЦЫЙ

«Новы дом» для будучых прызёраў адкрылі ўчора ў Мінску. Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы — гэта ўнікальны для постсавецкай прасторы комплекс. У ім не толькі залы для заняткаў, але і вучэбныя класы, пакоі для адпачынку, харэаграфічныя кабінеты, нават басейн і лазня. Для беларускіх грацый стварылі такія ўмовы, ад якіх нават у неспартсмена дух захоплівае. У адкрыцці цэнтра ўзяў удзел Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Фота БЕЛТА.

Побач з будынкам стаіць зроблены з каменю мяч і стужка з металу — своеасаблівы манумент усім юным гімнасткам. Дзве дзяўчынкі, што толькі выйшлі з Палаца, гадоў сямі, падыходзяць да яго. «Ну і стужка! Мне такую не ўзяць», — кажа адна з іх. Смяюцца, а другая раптам заўважае, што на мячы — адбітак далоні нашай славутай Марыны Лобач. Кладзе туды руку і кажа: «Хачу быць як яна!»

Марына ЛОБАЧ — першая савецкая алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы. Яна была адной з тых, хто разрэзаў учора чырвоную стужку падчас урачыстага адкрыцця будынка. Чэмпіёнка ўспамінае, у якіх умовах яна трэніравалася яшчэ ў часы СССР, у якіх памяшканнях да гэтага дня займаліся сённяшнія спартсменкі, і прызнаецца, што мяжы няма яе захапленню. «Тут мяне напаўняе натхненне і, галоўнае, — жаданне працаваць надалей», — падзялілася ўражаннямі яна.

Па словах **старшыні Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Алены СКРЫПЕЛЬ**, выхаванцы ў мастацкай гімнастыцы ўжо з гэтага дня пачнуць абжываць новы дом. Ён сапраўды ўнікальны, бо Беларусь адна з першых, хто збудаваў цэлы комплекс для такога віду спорту, што для невялікай краіны — дасягненне. «Цікавасць да мастацкай гімнастыкі пастаянна расце. Ён каласальны! Бацькі ахвотна аддаюць у яе маленькіх дзяўчынак. Дарэчы, сёння мы абмяркоўвалі з Прэзідэнтам, што варта таксама развіваць і мужчынскую мастацкую гімнастыку, набіраць таксама і хлопчыкаў», — дзеліцца Алена Скрыпель.

Звяртаючыся да прысутных падчас адкрыцця Палаца, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што жанчыны — гэта найлепшае, што ў нас ёсць. Палац гімнастыкі — сімвалічны падарунак для тых дзяўчынак, якія займаюцца мастацкай гімнастыкай, да надыходзячага Міжнароднага дня жанчын. І тых грошай, якія ўкладзены ў будынак, не шкада. Прэзідэнт выказаў удзячнасць усім, хто меў дачыненне да ўзвядзення гэтага цэнтра. Асаблівую ўдзячнасць ён выказаў будаўнікам. «Вось тут вы ўжо малайцы. Дамовіліся мы менш як год таму, што да 8 Сакавіка падорым гэтым цудоўным дзяўчатам, іх бацькам, усім тым, хто сёння займаецца, адказвае за мастацкую гімнастыку, за спорт, такі цудоўны і ўтульны палац, і мы гэта зрабілі. Вы, будаўнікі, гэта зрабілі. Я вельмі рэдка хвалю будаўнікоў, але шчыра вам удзячны», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што мастацкая гімнастыка ў Беларусі пакрыўджана не была, хоць раней такіх умоў для заняткаў спартсмены не мелі. Цяпер у іх ёсць дастойная пляцоўка для таго каб паказваць і надалей добрыя вынікі. «Я хацеў, каб вы тут не толькі працавалі. Работа спартсмена — жахлівая работа. Ведаю, як цяжка вам, асабліва маленькім, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да гімнастак. — Я хацеў бы, каб вы тут і аднавіцца маглі, і адпачыць. Таму жывіце ў гэтым доме дружна, мірна, працуйце, трэніруйцеся, адпачывайце, мы за вас будзем хварэць».

Аліна КАБАЕВА, алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы, Расія:

— Цудоўна, што такі комплекс у вас з'явіўся. Ён адзін з найлепшых у свеце, магу дакладна сказаць. Беларуская школа мастацкай гімнастыкі канкурыравала і раней з расійскай, і без такіх залаў. Паглядзім, што будзе надалей. Але я за канкурэнцыю, у гэтым сутнасць спорту. Тут сярод маіх даўніх сяброў я зноў сустрэла Юлію Раскіну, беларускага сярэбранага прызёра Алімпійскіх гульняў, якая зусім не змянілася. Гэта нібыта вярнула мяне ў мінулае на шмат гадоў назад. Увогуле для мяне шчасце знаходзіцца тут, у Беларусі, і вялікі гонар.

Таксама Прэзідэнт падзяліўся галоўным сакрэтам поспеху для спартсмена — не заціскацца і ні ў якім разе псіхалагічна сябе не напружваць, а старацца выступаць на спаборніцтвах так, нібыта на трэніроўцы. І гэта — выключна ўнутраная работа кожнага. «Калі вы гэту праблему ў сабе вырашыце, вы дакладна будзеце чэмпіёнкамі і свету, і Алімпійскіх гульняў. Яшчэ раз жадаю вам псіхалагічна добрага настрою, самаадданасці, мужнасці ў гэтым жаноцкім і ў той жа час мужчынскім відзе спорту», — пажадаў юным грацыям Аляксандр Лукашэнка.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

WP: ЗША разглядалі магчымасць прымянення ваеннай сілы ў дачыненні да ўлад Сірыі

Белы дом на мінулым тыдні абмяркоўваў магчымасць прымянення ваеннай сілы ў дачыненні да сірыйскага кіраўніцтва ў якасці пакарання за меркаванае прымяненне Дамаскам хімзброі ва Усходняй Гуце. Пра гэта паведаміла газета The Washington Post, спасылаючыся на неназваных афіцыйных асоб.

Па іх словах, нарада пад старшынствам прэзідэнта Дональда Трампа прайшла ў пачатку мінулага тыдня і ў ёй прымалі ўдзел, у прыватнасці, кіраўнік апарату супрацоўнікаў Белага дома Джон Кэлі, памочнік прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Герберт МакМастэр і міністр абароны Джэймс Мэціс.

Як піша газета, «Трамп запытаў пра варыянты дзеянняў з мэтай пакараць урад Башара Асада пасля паведамленняў аб прымяненні газападобнага хлору — па меншай меры ў сямі выпадках сёлета — і, магчыма, іншых атрутных рэчываў, у выніку чаго пацярпелі мірныя людзі ў раёнах, якія знаходзяцца пад кантролем апазіцыі».

Паводле адной з афіцыйных асоб, працягвае выданне, Трамп «не стаў настойваць на ваеннай акцыі» і ўдзельнікі нарады «прынялі рашэнне працягваць сачыць за развіццём сітуацыі».

Прадстаўленыя Пуціным узоры зброі трапяць у войскі ва ўстаноўленыя тэрміны

Расійскія войскі атрымаюць найноўшыя сістэмы ўзбраення, пра якія расказаў 1 сакавіка ў пасланні Федэральнаму Сходу прэзідэнт Уладзімір Пуцін, ва ўстаноўленыя тэрміны, заявіў міністр абароны Расіі генерал арміі Сяргей Шайгу.

«Прэзідэнт прадставіў шэраг найноўшых напрацовак абаронна-прамысловага комплексу, адзначыўшы, што асобныя ўзоры ўжо паступілі ў армію. Хачу адзначыць, што ўсё намечанае будзе рэалізавана ва ўстаноўленыя дзяржаўнымі кантрактамі тэрміны», — сказаў ён.

«Вярхоўны галоўнакамандуючы высока ацаніў работу па ўмацаванні ўзброеных сіл, павышэнні абараназдольнасці краіны. Ён падкрэсліў, што сёння Расія мае сучасную, кампактную і высокатэхналагічную армію», — падкрэсліў міністр абароны Расійскай Федэрацыі.

Міністр таксама адзначыў важнасць разгортвання сучаснай арбітальнай групоўкі ваенных спадарожнікаў. «Прэзідэнт Расіі не раз падкрэсліваў, што нашы армія і флот павінны не толькі адпавядаць патрабаванням сённяшняга дня, але і быць гатовымі да заўтрашніх спосабаў вядзення ўзброенай барацьбы. Безумоўна, рашэнне гэтай задачы непасрэдна залежыць ад наяўнасці сучаснай арбітальнай групоўкі спадарожнікаў ваеннага прызначэння», — сказаў ён.

У Шры-Ланцы ўведзены рэжым надзвычайнага становішча з-за сутыкненняў будыстаў і мусульман

Улады Шры-Ланкі ўвялі ў аўторак рэжым надзвычайнага становішча на ўсёй тэрыторыі краіны на 10 дзён у сувязі з сутыкненнямі паміж будыстамі і мусульманамі ў раёне Кандзі ў Цэнтральнай правінцыі.

Пра гэта паведаміў афіцыйны прадстаўнік урада Шры-Ланкі Даясіры Джаясекара.

«На спецыяльным пасяджэнні кабінета міністраў было прынята рашэнне абвясціць надзвычайнае становішча тэрмінам на 10 дзён для прадухілення распаўсюджвання міжабшчынных беспарадкаў на іншыя часткі краіны, — прыводзіць яго словы агенцтва Reuters. — Было таксама прынята рашэнне прыняць жорсткія меры супраць людзей, якія заклікаюць да гвалту праз «Фэйсбук».

Улады Шры-Ланкі ўчора накіравалі воінскія часці і дадатковыя сілы паліцыі ў акругу Кандзі для прадухілення міжабшчынных сутыкненняў. Гэта адбылося пасля таго, як у названым рэгіёне падпалілі некалькі крам, якія належаць мусульманам.

Напружанасць паміж прадстаўнікамі абшчын будыстаў, якія складаюць большасць насельніцтва Шры-Ланкі (каля 70 %), і мусульман (каля 10 % насельніцтва) нарастала ў краіне на працягу апошняга года.

■ Парламенцкі дзённік

ДАПРАЦУЮЦЬ ЗАКОН АБ МАСАВЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ

Дапрацоўку праекта закона па пытаннях правядзення масавых мерапрыемстваў абмеркавалі дэпутаты і прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў. Пасяджэнне рабочай групы прайшло ў Палацы прадстаўнікоў.

Па словах **кіраўніка рабочай групы па дапрацоўцы законапраекта, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Валерыя САЎКО**, праект накіраваны на ўдасканаленне прававога рэгулявання адносін у сферы арганізацыі правядзення масавых мерапрыемстваў. Зыходзячы з гэтага мяркуецца ўнесці карэкціроўкі ў закон «Аб масавых мерапрыемствах» і Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях з улікам правапрымяняльнай практыкі.

З новаўвядзенняў парламентарыі прапаноўвалі ўвесці паведамляльны парадак правядзення масавых мерапрыемстваў у пастаянных месцах для іх правядзення, якія вызначаны мясцовымі выканкамамі. Таксама прапаноўвалася прадугледзець шэраг мер па забеспячэнні грамадскага парадку, бяспекі і дадатковыя патрабаванні да арганізатараў масавых мерапрыемстваў. Плануецца ўрэгуляваць і працэдуру адклікання заявы аб правядзенні масавага мерапрыемства.

У сваю чаргу прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў выказалі сваё меркаванне па законапраекце. У прыватнасці яны прапаноўвалі адмяніць патрабаванні аб аплаце арганізатарамі расходаў на забеспячэнне грамадскага парадку. Не менш важным палічылі таксама ўдакладніць азначэнне масавага мерапрыемства ў законе.

Нагадаем, што Закон Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах» быў прыняты ў 1997 годзе. У кастрычніку мінулага года праект аб дапаўненнях у закон быў прыняты Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні. У цяперашні момант ён рыхтуецца да другога.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

СВЕТ ВАЧЫМА ЖАНЧЫНЫ

Жанчына ўмее хутка пераключацца з адной справы на іншую, і пры гэтым амаль ніколі не засяроджваецца поўнасцю толькі на чымсьці адным, трымаючы пад кантролем адначасова некалькі момантаў. Жанчына-кіраўнік — гэта заўжды крыху матуля, якая апякае, дапамагае і няньчыцца з падначаленымі. Жанчына можа ахвяраваць сваёй кар'ерай дзеля мужа, каб дапамагчы яму ісці ўгару. Жанчына даказвае, на што яна здольная, уласным прыкладам — проста ідзе і робіць... Такія меркаванні пра ролю жанчыны-кіраўніка-журналіста гучалі падчас круглага стала «Свет вачыма жанчыны», дзе сабраліся выдатныя прадстаўнікі гэтай прафесіі.

— Жанчыны больш адказна падыходзяць да справы, больш уважлівыя да дробязяў, якія ўпускаюць мужчыны. Таму жанчыны-кіраўнікі часта большых поспехаў дасягаюць у журналісцкім рамястве. Амаль траціна кіраўнікоў рэгіянальных каналаў — жанчыны, а чатыры з пяці каналаў Белтэлерадыёкампаніі ўзначальваюць жанчыны. Пэўна, гэта нездарма, — выказаўся **Павел ЛЁГКІ, намеснік міністра інфармацыі.**

Прысутныя падкрэслілі, што ў сучасным свеце роля жанчыны як ахоўніцы ачага павінна заставацца, але ўжо не быць дамінантнай, як раней. Цяпер нельга адмовіць сабе ў жаданні быць паспяховымі і раскрываць патэнцыял, закладзены прыродай, чым жанчыны і займаюцца.

— Самы галоўны прарыў для нашых жанчын — магчымасць быць самазанятай. Адпаведны ўказ даў жанчынам магчымасць займацца сям'ёй і дзецьмі, у той жа час рэалізоўвацца для сябе і грамадства. Плаціць адзіны падатак і займацца дызайнам, цырульніцкай справай, быць візажыстам, — заўважыла **Ганна СТАРАВОЙТАВА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.** — Гэта дазваляе жанчыне стаць паспяховай і рэалізаваць сябе.

Мінскае аб'яднанне Беларускага саюза жанчын на шляху стварэння клуба, які дазволіць жанчынам, што хочуць пайсці па шляху прадпрымальніцтва і малога бізнесу, раскрыць алгарытм праходжання шляху па пачатку сваёй справы, дадала яна.

Ірына СІДАРОК.

Надзённыя пытанні дапаможа вырашыць улада

У суботу, 10 сакавіка, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах чарговы раз адбудуцца прамыя тэлефонныя лініі. З 9.00 да 12.00 іх правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч Альшэўскі (8 016 221 31 21);

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблсавета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч Цярэнцьеў (8 021 222 22 22);

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч Канюшка (8 023 233 12 37);

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч Папоў (8 015 273 56 44);

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч Чыкіда (8 022 250 18 69);

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч Гурыновіч (8 017 500 41 60);

намеснік старшыні МІНГАРВЫКАНКАМА Ігар Віктаравіч Юркевіч (8 017 222 44 44).

■ Статыстыка

Замуж пасля 60 гадоў

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у нашай краіне пражывае 5,1 мільёна жанчын. Гэта 53,4 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва. Большасць (79 %) «прапісалася» ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу. І толькі кожная пятая беларуска жыве ў вёсцы.

Сярэдні ўзрост жанчын — 42,6 года. Прычым гараджанкі значна маладзейшыя за сяльчанак: іх сярэдні ўзрост — 41,2 года і 47,8 года адпаведна.

Самымі жаночымі сферамі дзейнасці застаюцца ахова здароўя і сацыяльныя паслугі (там 85,7 % работнікаў — прадстаўніцы прыгожага полу), адукацыя (81,7 %), фінансы і страхаванне (74,8 %), паслугі па часовым пражыванні і харчаванні (70,1 %). Менш за ўсё дам у сельскай, лясной і рыбнай гаспадарцы (39,3 %), транспарце, складзіраванні і кур'ерскай дзейнасці (37,2 %), будаўніцтве (19,8 %). Сярод працуючых у арганізацыях беларусак кожная трэцяя мае вышэйшую адукацыю, кожная чацвёртая — сярэднюю спецыяльную, кожная шостая — прафесійна-тэхнічную.

Летась выйшлі замуж 66,2 тысячы жанчын, для траціны з іх гэта ўжо не першы шлюб. Сярэдні ўзрост нявесты — 25,8 года (у 2011-м ён складаў 24,5 года). Каля тысячы дам у мінулым годзе заключылі шлюб пасля 60-ці.

У вольны час беларускі не забываюць пра спорт. Чвэрць жанчын ад 16 гадоў і старэйшыя займаюцца фізічнай культурай, пры гэтым кожная шостая ўдзяляе час падтрыманню формы штодзённа, амаль 42 % трэніруюцца два-тры разы на тыдзень.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

■ Праект

ЗАСПЯВАЙ ПЕСНЮ ПРА БРЭСТ

Брэсцкі гарвыканкам аб'явіў конкурс на найлепшую песню пра родны горад. Музычны праект «Песні пра Брэст» прысвячаецца 1000-гадоваму юбілею горада, які будзе святкавацца налета. Распрацавана і апублікавана палажэнне аб конкурсе для тых, хто пажадае далучыцца да ўдзелу.

— А паспрабаваць сябе ў такой творчай справе запрашаем і прафесійных, і самадзейных паэтаў ды кампазітараў, — расказала **загадчык сектара культуры аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гарвыканкама Святлана СЯМАШКА.**

Паводле слоў Святланы Мікалаеўны, ідэя праекта зарадзілася не ўчора. Апошнім часам і ў сектар культуры, і да старшыні гарвыканкама звярталіся аўтары песень з просьбай уключыць іх творы ў праграму святочных канцэртаў. Вось і вырашылі пашукаць яшчэ больш талентаў. А заадно і падштурхнуць творчых людзей да напісання песень пра горад. Гэта могуць быць як патрыятычныя, так і лірычныя творы. Толькі б яны былі прыгожыя, яркія, ну і сучасныя, такія, якія хацелася б спяваць.

Паводле ўмоў конкурсу, словы песні павінны быць на беларускай альбо рускай мовах. Дапускаецца аранжыроўка твора прафесіяналамі ў галіне музыкі. Прапановы прымаюцца да 1 верасня. Конкурс пройдзе ў тры этапы: адборачны тур, падрыхтоўка песень да выканання і само выкананне альбо канцэрт. Ацэньваць работы будзе прафесійнае журы. Фінал запланаваны ў маі, напярэдадні святкавання тысячагоддзя. А дзясятка паўтара найлепшых твораў арганізатары плануюць апублікаваць у нотным зборніку — выніковым альбоме праекта «Песні пра Брэст». «Нават праз 50 альбо 100 гадоў нашчадкі змогуць знайсці гэты зборнік у бібліятэцы і параўнаць песні свайго часу з нашымі, — сказала Святлана Сямашка. — А раптам мы знойдзем такога таленавітага аўтара, песню якога ўжо праз паўгода-год усе будзем слухаць са сваіх тэлефонаў? Гэта ж тое, што нас, брастаўчан, здольнае аб'ядноўваць».

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Ёсць нагода

ДЛЯ ДАРАГІХ ДАМ

У Міжнародны жаночы дзень вядучыя тэлеканала АНТ падрыхтавалі сваім сувядучым-паненкам эфірны выхадны, а гледачам асаблівы падарунак — спецыяльны святочны выпуск праграмы «Наша раніца».

Як высветліла «Звязда», цэлы дзень весці ўсе навіны, а таксама спартыўны агляд, будуць выключна мужчыны — разумныя, дасціпныя і прыгожыя, якія абяцаюць радаваць вока і слых жаночай аўдыторыі.

Творчая каманда «Нашай раніцы» пайшла яшчэ далей і вырашыла паказаць ідэальны жаночы дзень... зноў жа, мужчынскімі вачыма. «Неафіцыйны дэвіз святочнай праграмы — «Адчуйце наш боль, мужчыны!» — інтрыгуе кіраўнік дырэкцыі ранішняга вяшчання Таццяна Рудакоўская. У прыватнасці, вядучым давядзецца выпрабаваць на сабе касметычныя працэдуры па доглядзе за тварам, атрымаць кансультацыю дыетолага і, што называецца, як след пранікнуцца, што такое дэпіляцыя... А некаторым трэба будзе праявіць сябе на кухні — не тэлевізійнай, а звычайнай. Прычым, мяркуючы па анонсах, якія з'явіліся ў сацыяльных сетках тэлеканала, там будзе горача ў прамым і пераносным сэнсе.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Фота прадастаўлена тэлеканалам АНТ.

Танцор Мікалай ЛЁЛІС, фітнес-трэнер і мадэль Андрэй ТКАЧОЎ і чэмпіён Беларусі па бодзібілдынгу Арцём ЛУКАШЭНКА ў рэкламным ролiку паказалі, што мужчына на кухні — гэта эфектна, весела і ў кулінарным сэнсе вынікова.

■ Прыемны падарунак

ВОСЬ ЯНА — МАЯ МАТУЛЯ

У Беразіне амаль месяц упрыгожваюць гандлёвую зону на першым паверсе рынку «ТрыА» ад ТАА «Пухавічы-гандаль» малюнкі 15 юных мастакоў. Яны — ад удзельнікаў конкурсу «Вось яна — мая матуля», які рынак праводзіў сумесна з рэдакцыяй газеты «Бярэзінская панарама» да 8 Сакавіка. Днямі падвялі яго вынікі.

— Бясспрэчна, усе 15 малюнкаў цікавыя, творчыя, відаць, што выкананы з любоўю, — зазначыў **дырэктар рынка Максім КАСОЎСКІ.** — Дзякуй усім, хто паўдзельнічаў у нашым конкурсе. Думаю, вы зрабілі самы каштоўны падарунак сваім любімым матулям.

Здзівіў, прываражыў творчы малюнак, выкананы фарбамі, аўтарства дзевяцікласніцы Паліны Ермаковай.

— Матулю было намаляваць нескладана. Партрэт — мой любімы жанр, — сказала Паліна.

Стыльная кароткая прычоска, чырвоныя вусны, выразныя карыя вочы — такой паказала матулю чацвёртакласніца Анастасія Кашчыц, якая наведвае школу мастацтваў. Вядома ж, маляваць ёй падабаецца. Даведалася пра конкурс ад сябровак і вырашыла зрабіць матулі падарунак.

Сярод самых маленькіх удзельнікаў-пераможцаў — пяцігадовая Сафія Гліністая. Яна любіць маляваць і гуляць з хатнімі гадаванцамі. І вядзе свой канал superstar на YouTube, дзе выкладае жыццёвыя відэа на розную тэматыку.

— Там ёсць відэа нават пра тое, як малявала маму. А хутка з'явіцца і пра сам конкурс, як праходзіла ўзнагароджванне, — запэўніла Сафія.

Юлія БУКЕЛЬ. Фота аўтара

Сафія ГЛІНІСТАЯ з мамай Дар'яй, Анастасія КАШЧЫЦ з мамай Вольгай, Максім КАСОЎСКІ, Паліна ЕРМАКОВА.

■ На слыху

Сястра выратавала брата

Яны жывуць у розных вёсках Горацкага раёна на адлегласці пяці кіламетраў, але моцны снег не спыніў жанчыну, калі яна разам з мужам адправілася наведаць брата Мікалая, які цяжка перахварэў. Калі сужэнцы падышлі да яго дома, то ўбачылі, што ў калідоры гарыць падлога.

Кінуліся ў хату, а там няма чым дыхаць ад смуроднага дыму. Гаспадара яны знайшлі ў адным з пакояў, ён ляжаў на парозе без прытомнасці і з тэлефоннай трубкай у руках. Хуценька выцягнулі яго на свежае паветра. На іх крыкі аб дапамозе збегліся суседзі і агульнымі намаганнямі справіліся з агнём яшчэ да прыезду ратавальнікаў.

— Пажар, паводле папярэдніх даных, адбыўся з-за коўдры, якая ляжала на печы. Яе гаспадар заліў вадой, але, відаць, гарэла яшчэ адна рэч, якую ён выкінуў у калідор і пакінуў без нагляду. Ад яе і ўзнік пажар, — паведаміла старшы інспектар Цэнтра бяспекі жыццядзейнасці і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вольга Нехарошых.

Выратаванага з дыягназам атручэнне прадуктамі гарэння шпіталізавалі. Дом практычна не пацярпеў: пашкоджана ўсяго два квадратныя метры падлогі ў калідоры.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Нерухомасць

ЧАС, КАЛІ ПОПЫТ АБГАНЯЕ ПРАПАНОВУ

Эксперты прагназуюць да канца года далейшае падаражанне жылля — але не больш чым на 7—10 працэнтаў

Ні для кога не сакрэт, што кожны год студзень з'яўляецца месяцам зацішша на рынку нерухомасці. У гэты перыяд патэнцыйныя пакупнікі альбо спрабуюць прыстасавацца да пагаршэння матэрыяльнага становішча з прычыны росту абменнага курса валют, альбо чакаюць хуткага наступу падобных негатыўных змен у эканоміцы. Аднак гэты студзень стаў выключэннем — зніжэння актыўнасці пакупнікоў не адбылося.

Апошнія два гады сталічны рынак жылля стабільна ставіў рэкорды — па мінімальных цэнах, аб'ёме прапановы, максімальнай колькасці здзелак. Мінулы перыяд (студзень і люты) даў зразумець, што 2018 год па частцы рэкордаў таксама можа здзівіць. Зрабіць аналіз сітуацыі ў жыллёвай сферы сталіцы і «намаляваць» прагноз на год карэспандэнту «Звязды» дапамагае наш пастаянны эксперт — кіраўнік агенцтва «БепЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай Прасталупаў.

Каля 30 % — у Мінску, 70 % — у Брэсце

Наш спікер адзначае, што ў снежні мінулага года ў Мінску было зафіксавана 1600 здзелак, у студзені — 1150, а ў лютым — 1144 здзелкі. Два першыя месяцы года мы маем паказчыкі «вышэй за сярэдні». Адкуль у насельніцтва раптам «прачнулася» такая несанкцыянаваная актыўнасць?

Цяпер агульная колькасць кватэр і асобных пакояў на продаж — гэта крыху больш за пяць тысяч аб'ектаў.

Адказ відавочны. Пакупнікі сталі на парадак больш выкарыстоўваць пазыковыя сродкі. Напрыклад, у лютым у Мінску 30 % здзелак было аформлена з дапамогай крэдытных грошай. У той жа час у Брэсце крэдытнымі рэсурсамі скарысталіся 70 % пакупнікоў жылой нерухомасці. Чаму? Ды таму што пры нашай сярэдняй зарплаце вялікі крэдыт сярэднестатыстычнаму гараджаніну не дадуць. У сталіцы яго хопіць на маленькі кавалачак уласнага жылля. А ў Брэсце цэны за «квадрат» ніжэйшыя, а значыць, скарыстаўшыся крэдытамі, можна набыць нерухомасць.

Асаблівасці папулярнасці

Паводле інфармацыі найбуйнейшых агенцтваў сталіцы, найбольшым попытам у гэтыя два месяцы карысталіся адна- і двухпакаёвыя кватэры — іх доля ў агульнай колькасці здзелак прыкладна роўная — 38 % і 36 % адпаведна. У той час як кватэры з чатырма і больш пакоямі выбралі толькі 4 % пакупнікоў.

Сярод аднапакаёвых найбольшай папулярнасцю ў пакупнікоў карысталіся кватэры, размешчаныя ў каркасна-блочных дамах, маладзейшых за 2000 год пабудовы. А вось сярод прададзеных у студзені — лютым двухпакаёвых кватэр пераважалі хрушчоўкі-брэжнеўкі. У складзе выбраных трохпакаёвак пераважалі стандартныя панэльныя апартамены 1977—1999 гадоў пабудовы.

Цэннік сакавіка

Новай тэндэнцыяй апошніх двух месяцаў стала павелічэнне попыту на танныя маленькія аднапакаёвыя кватэры. Калі прапанаванае жыллё прадаецца па рынкавым кошце (1200—1230 долараў за «квадрат»), то яно адшукае сабе новых гаспадароў ужо праз тыдзень.

Праўда, такіх кватэр зараз на рынку адзінкі. Цэннік аднапакаёвак рэальна пачынаецца з 70 тысяч рублёў. У дыяпазоне з 70 да 80 тысяч рублёў на рынку выстаўлена на продаж толькі 48 аб'ектаў нерухомасці. Гэта кватэры з вельмі маленькімі кухнямі (крыху больш за 5 квадратных метраў), і знаходзяцца яны на крайніх паверхах старых пяціпавярховых дамоў. Падобнае жыллё ў дзевяціпавярховых панэльках будзе каштаваць даражэй. Аднапакаёўкі плошчай 33—40 квадратных метраў выстаўлены ўжо за 86—94 тысячы рублёў. Больш прасторныя аднапакаёвыя кватэры (43—47 «квадратаў») прапануюць ужо за 104—116 тысяч рублёў.

Самыя бюджэтныя двухпакаёвыя кватэры маюць цэннік, які пачынаецца з 98—100 тысяч рублёў. Да 110 тысяч рублёў магчыма адшукаць на рынку двухпакаёўкі плошчай да 46 «квадратаў». Стандартныя «двушкі» плошчай ад 43 да 55 квадратных метраў звычайна каштуюць ужо ў межах 110—126 тысяч рублёў. Максімальная колькасць прапановы двухпакаёвых кватэр адпавядае цэнніку ад 130 да 150 тысяч рублёў.

Мінімальны кошт трохпакаёвых кватэр складае каля 110 тысяч рублёў. У гэту катэгорыю трапляюць жылыя памяшканні з агульнай плошчай ад 55 да 60 квадратных метраў. У падобных кватэрах звычайна сумежныя пакоі, і знаходзяцца такія памяшканні на крайніх паверхах пяціпавярховых дамоў. Сярэдні цэннік бюджэтных шматпакаёвых кватэр вагаецца ў межах ад 120 да 130 тысяч рублёў. Стандартныя трохпакаёвыя кватэры плошчай да 70 квадратных метраў прапануюцца на другасным рынку па кошце ад 140 да 160 тысяч рублёў.

Тры тыпы здзелак

Самы распаўсюджаны тып здзелак на нашым рынку — гэта здзелкі з кватэрамі стандартных спажывецкіх якасцяў. На іх прыпадае каля 65—70 % усіх здзелак, якія заключаюцца. Як правіла, такую кватэру можна сустрэць у любым класе дамоў, прадстаўленых на рынку. Выключэнне складаюць клубныя дамы або дамы ў прэстыжнай забудове. Асноўны крытэрый такога жылля — бюджэтны рамонт эканом-класа з мінімальным наборам мэблі або поўнай яе адсутнасцю. Пасля куплі такія кватэры запатрабуюць як мінімум касметычны рамонт. У некаторых выпадках патрабуюцца больш сур'ёзныя ўкладанні — замена аконных рам, падлогавага пакрыцця або пліткі ў санвузлах. У дамах, пабудаваных пасля 2000 года, кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў — гэта жыллё без апрацоўкі (чарнавая будаўнічая апрацоўка) або са стандартным «мапідаўскім» рамонтам.

Гатовыя да пражывання кватэры — гэта жыллё з добрым, дастаткова свежым рамонтам і часткова мэбляй. З кватэрамі гэтага класа якасці заключаецца каля 25—30 % ад усяго аб'ёму здзелак. Рамонт у такім жыллі выкананы з выкарыстаннем сучасных матэрыялаў і ўключае ў сябе якасныя вокны, міжпакаёвыя дзверы, плітку і падлогавае пакрыццё. З мэблі, як правіла, застаецца ўбудаваная кухня з тэхнікай і ўбудаваныя сістэмы захоўвання (шафы-купэ альбо гардэробная). Прывабнасць гэтых кватэр заключаецца ў тым, што, дзякуючы наяўнасці добрага і пры гэтым зробленага зусім нядаўна рамонту, будучы ўласнік можа спакойна заязджаць у кватэру і не думаць пра абнаўленне яшчэ доўгі час.

Услед за першасным рынкам пачне даражэць і рынак гатовага жылля.

Асобным класам можна вылучыць элітнае жыллё. Да адметных асаблівасцяў такіх кватэр варта аднесці іх размяшчэнне ў цэнтры горада альбо ў прэстыжных забудовах, альбо ў складзе асобных клубных жылых дамоў. Сучасныя прэстыжныя комплексы маюць абгароджаную тэрыторыю і відэаназіранне, а таксама паркінг або ахоўныя парковачныя месцы з разліку не менш за адно машынаместа на кватэру. Такія кватэры маюць вельмі якасны, часта дызайнерскі рамонт, выкананы з выкарыстаннем дарагіх матэрыялаў. На долю элітнага жылля прыпадае ад 1 % да 3 % заключаных здзелак.

Што датычыцца кошту, то тут варта адрозніваць цэны прапановы і цэны рэальных здзелак. Першыя шмат у чым адлюстроўваюць не аб'ектыўныя тэндэнцыі рынку, а жаданні ўласнікаў. Таму некаторы рост за студзень — люты па іх відаць, але не па ўсіх сегментах якасці і ў цэлым не больш за 5—6 %. У той час як цэны фактычна праведзеных здзелак засталіся без істотных змен, па іх была адзначана цікавая асаблівасць — збліжэнне кватэр ніжняга коштавага дыяпазону (стандартных спажывецкіх якасцяў, плюс 2 % да кошту квадратнага метра ў снежні 2017-га) і кватэр, гатовых да пражывання (з рамонтам і мэбляй, мінус 2 % да кошту «квадрата» леташняга снежня).

Прапанова паменшылася на траціну

На думку Мікалая Прасталупава, на пачатак вясны колькасць жылой нерухомасці, выстаўленай на продаж, стала меншай на 30 % у параўнанні з годам раней. Цяпер агульная колькасць кватэр і асобных пакояў на продаж — гэта крыху больш за пяць тысяч аб'ектаў. Годам раней было сем тысяч жылых памяшканняў. Мікалай Прасталупаў лічыць, што людзі проста адмаўляюцца прадаваць сваё жыллё, таму што перадумалі паляпшаць жыллёвыя ўмовы. Дакладней, не перадумалі, а не маюць магчымасці. А ў выніку сем'і з дзецьмі жывуць у аднапакаёвых кватэрах, якія на рынку сталі дэфіцытам. Не хапае на рынку і невялікіх двухпакаёвых кватэр.

З такім перакосам попыту і прапановы павінна было справіцца будаўніцтва жылля. Але і тут праблема. Горад не дае забудоўшчыкам шырокія будаўнічыя пляцоўкі. Вылучаюцца толькі кропкавыя ўчасткі зямлі, ды і тыя абцяжараныя зносам.

У гэтай сітуацыі першасны рынак жылля змяняецца значна хутчэй за другасны. Мікалай Прасталупаў лічыць, што ўслед за першасным рынкам пачне даражэць і рынак гатовага жылля. Істотна цэны павялічыцца не змогуць, бо ў людзей няма вялікіх грошай, кажа суразмоўнік. Але за год, на думку Мікалая Прасталупава, яны ўсё ж такі вырастуць на 7—10 %.

Сяргей КУРКАЧ

■ Прырода і мы

Каб планету ратаваць, трэба смецце раздзяляць!

Неўзабаве ва ўсіх беларускіх школах з'явіцца інтэрактыўны ўрок «Спецыяльны атрад маленькіх экаменаў». На падставе відэароліка, дзе ў гульнявой форме даюцца заданні і расказваецца пра неабходнасць асобнага збору смецця, настаўнікі змогуць правесці з вучнямі малодшых класаў пазнавальную інфармацыйную гадзіну.

У сталічнай сярэдняй школе № 215 такі ўрок правялі супрацоўнікі ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». Вядучы расказваў вучням 3-4 класаў цікавыя факты аб перапрацоўцы смецця і даваў заданні. Дзеці малявалі, гулялі, спявалі. А яшчэ... пасябравалі з Экаменам, які ўзяў з іх клятву, што цяпер яны будуць збіраць смецце толькі асобна і сачыць, каб тое ж рабілі іншыя.

— Падобны ўрок мы правялі ў школах Гродна і Гомеля. Зразумела, што трапіць у кожную з амаль трох тысяч устаноў адукацыі краіны мы не можам, таму на падставе праведзеных трох урокаў падрыхтавалі інтэрактыўны відэаўрок, — расказала **Ніна КУЛЬБЕДА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Яго мы ў сакавіку разам з усімі матэрыяламі да роліка разашлём па школах.

Каб стымуляваць школы праводзіць такія заняткі, аператар аб'яўляе конкурс «Героям спяваць лёгка». Трэба правесці ў сябе ўрок па відэароліку, зрабіць некалькі здымкаў і вывучыць песню маленькіх экаменаў. Пасля зняць пад яе кліп, дзе паказаць, навошта ратаваць планету ад смецця і збіраць адходы асобна, і даслаць на сайт аператара targe+99by, дзе падрабязна апісаны ўмовы конкурсу.

— Дзецям падабаецца навучанне ў такой простай гульнявой форме. Яны лепш засвойваюць матэрыял. Прыйшоўшы дадому, у добрым сэнсе «вынесуць мозг» бацькам, расказваючы, чаму так важна і патрэбна збіраць смецце асобна. Ды і самі пачнуць сартаваць адходы, — упэўнена **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».**

Спыняць працу з дзецьмі арганізацыя на гэтым не збіраецца. Для вучняў сярэдняга ўзросту і старшакласнікаў з часам таксама будуць арганізаваны пазнавальныя ўрокі больш сур'ёзнага кірунку. У планах нават стварэнне праграмнай гульні па асобным зборы адходаў. А ўжо цяпер цікаўныя могуць спампаваць з сайта аператара бясплатныя стыкеры ў месенджары «Тэлеграм». Гэта вясёлыя сюжэты з янотамі-сарціроўшчыкамі і трапнымі надпісамі.

Усе ўдзельнікі незвычайнага ўрока сталі юнымі экаменамі і атрымалі падарункі і маску гераічнага экамена, у якой многія так і пайшлі дадому, а можа, і ратаваць свет ад смецця, хто ведае...

Ірына СІДАРОК

ЗВАРШЧЫК, СЛЕДЧЫ, АЎТАІНСТРУКТАР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па адукацыі Надзея швачка. Але папрацаваць па спецыяльнасці не паспела: выйшла замуж, потым адзін дэкрэтны водпуск, другі... Калі шукала работу, убачыла аб'яву ў газеце «Патрабуецца зваршчык аўтаматычнай і паўаўтаматычнай зваркі». Адгукнулася. На заводзе жанчыну адправілі на тры месяцы на вучобу — яна справілася за паўтара.

— Муж думаў, я буду проста работу робата правяраць — а тут сама вару. Спачатку засмуціўся. «Ды не працягнеш ты і года», — казаў. А мне ўсё лёгка давалася. Я не войкала: узяла апарат і пачала працаваць. Трэба бэлькі трохметровыя перакласці ці бухту (маток. — **Аўт.**) дроту прыцягнуць (а яна 15 кілаграмаў важыць) — усё сама раблю.

Калегі-мужчыны спачатку смяяліся. «Я пра сябе думала: ну-ну, паглядзім. Цяпер усё інакш: вітаюцца, паважаюць. У карты з імі гуляю ў абед. Як «пагоны» павешу, усміхаюцца, што са мной лепш не жартаваць. Яны ж сумуюць, калі мяне няма».

— Мужчыны прапануюць зрабіць за вас цяжкую работу?

— Я сабе такога не дазваляю. Бо гэта мае абавязкі: калі я не буду выконваць іх так, як павінна, не буду столькі зарабляць. У нас жа здзельная аплата (у сярэднім зваршчыкі на гэтым заводзе атрымліваюць 1000 рублёў. — **Аўт.**). Дый у мужыкоў свае жонкі дома, ім таксама трэба грошы ў сям'ю несці.

Летась Надзея ўдзельнічала ў рэспубліканскім конкурсе зваршчыкаў. Адзіная жанчына, яна прыцягнула шмат увагі. Прызнаецца, праз гэта разгубілася, заняла толькі 20-е месца (усяго было каля 150 удзельнікаў). Але з трох чалавек, што прадстаўлялі на конкурсе дзяржынскі завод, яна была найлепшая.

Працоўная змена Надзеі доўжыцца восем гадзін. Водпуск — 39 дзён. Муж гераіні, дарэчы, таксама працуе электрагазазваршчыкам, толькі на іншым прадпрыемстве.

— Ён па «вайберы» неяк тэлефануе мне, бачыць мяне брудную і кажа: «Ну ўсё, больш падчас працы не сазвоньваемся», — смяецца Надзея. — Я, бывае, нават больш за яго зарабляю. У яго тады адразу настрой падае, ходзіць пануры.

Жанчына спраўляецца і з «мужчынскімі» абавязкамі па доме. Памяняць разетку ці ўставіць у дзверы ручкі? Лёгка! Пры гэтым Надзея добра гатуе: варыць супы, пячэ пірагі з вішняй. Па вечарах робіць з дзецьмі ўрокі: яе сынам восем і дзесяць гадоў.

— Я нармальны чалавек! — усміхаецца. — Як з работы выходжу — зусім іншая. І манікюр раблю, і сукенкі ды абцасы нашу. Зімой толькі на абцасах не хаджу: яшчэ нос разаб'ю, давядзецца на бальнічны ісці, а працаваць жа трэба.

Цікавімся, якія падарункі гераіня атрымлівае на 8 Сакавіка. Надзея расказвае, што муж дорыць ёй залатыя ўпрыгажэнні. Толькі носіць яна іх рэдка: на работу ж не надзенеш, паабдзіраюцца. Калегі — трое мужчын, што разам з ёй у брыгадзе — летась падарылі грошы. «Ім да 23 лютага даюць прэмію. Яны 15 рублёў жонцы нясуць, а пяцёрку пакідаюць, каб Надзьцы на 8 Сакавіка падарунак зрабіць, — смяецца. — Кветкі? Не люблю. У мяне ніводнага вазона дома няма. Жанчынам звычайна падабаюцца букеты, а мне шкада патрачаных грошай. Кветкі завянуць, ты іх выкінеш — ну што гэта за падарунак?»

Часам калегі кажуць камплімenты. Надзеі прыемна, але выгляду не падае.

Якой мусіць быць сапраўдная жанчына? «Не такой, як я. Я мужык у спадніцы», — жартуе гераіня.

«Самы доўгі допыт цягнуўся восем гадзін»

Сустрэўшы **Алену МАРОЗ** на вуліцы, наўрад ці здагадаешся, кім працуе гэта прыгажуня. Яна **старшы следчы Фрунзенскага (г. Мінска) раённага аддзела Следчага камітэта.**

— Усведамленне таго, што хачу быць юрыстам, прыйшло ў 10—11 класе. Добра спрацавала агітацыйная група Акадэміі МУС, якая прыходзіла да нас у ліцэй. Чым зацікавіла прафесія следчага? Калі спытаць маіх сяброў, сям'ю, усе скажуць, што я — змагар за справядлівасць. Тым больш дзяўчына ў форме заўсёды выглядае прыгожа.

Пры паступленні ў акадэмію Алена вельмі хвалявалася. Конкурс быў шалёны: дзяўчат 20 на месца. Прахадныя балы — нароўні з БДУ. Але для яе ўсё склалася ўдала. ВНУ Алена скончыла з чырвоным дыпломам. Тата і мама, вядома, хвалююцца за дачку, але выбар прафесіі падтрымалі.

Следчым дзяўчына працуе чацвёрты год. Расследуе цяжкія і асабліва цяжкія крымінальныя справы. У асноўным гэта незаконны абарот наркотыкаў, гвалтоўныя дзеянні. «Найбольш складаныя злачынствы тыя, дзе пацярпелымі з'яўляюцца маленькія дзеці, — прызнаецца гераіня. — Такія справы заўсёды запамінаюцца. Вельмі цяжка не прапускаць праз сябе гэтыя гісторыі і размяжоўваць асабістую прастору і работу. Натуральна, ты хвалюешся за дзяцей».

— Ці ўдаецца адключаць эмоцыі і кіравацца ў рабоце толькі логікай?

— Я лічу, у мяне атрымліваецца ставіцца нейтральна да ўсіх удзельнікаў крымінальнай справы. Гэта залог якаснага расследавання, бо як бы ні хацелася ў некаторых сітуацыях падтрымаць нейкі бок, трэба дзейнічаць згодна з законам, а не пачуццямі.

А вось жаночая інтуіцыя ў рабоце дапамагае. Алена тлумачыць: следчы — прафесія творчая, якая прадугледжвае нестандартны падыход. Трэба ўлічваць мноства варыянтаў развіцця падзей, бо ніколі не ведаеш, як стане паводзіць сябе чалавек у нейкай сітуацыі.

— Бывала, што дапытваныя ставіліся да вас несур'ёзна?

— Гэта вельмі хутка праходзіла, літаральна пасля першых дадатковых пытанняў, — усміхаецца дзяўчына. І ўспамінае, што самы доўгі допыт у яе практыцы цягнуўся восем гадзін: сведка ніяк не хацеў казаць праўду.

Два-тры разы на месяц Алена заступае на сутачнае дзяжурства. Пры неабходнасці разам з аператыўнай групай выязджае на месца злачынства. У дзень бывае да 10 выездаў. Следчы ў гэтай групе галоўны, таму ў часовым падначаленні маладой дзяўчыны могуць быць нават падпалкоўнікі.

У Фрунзенскім раённым аддзеле, дарэчы, працуе шмат прадстаўніц прыгожага полу. «Мне здаецца, жанчыны — яшчэ больш грозныя следчыя, чым мужчыны, — заўважае гераіня. — Мы вельмі стараемся дакапацца да праўды».

У вольны час Алена займаецца веласпортам. Кажа, гэта дапамагае пераключыцца ў думках ад работы. Плюс трымаць сябе ў добрай форме важна для работніка праваахоўных органаў: раз на год даводзіцца здаваць нарматывы фізпадрыхтоўкі.

Дзяўчына прызнаецца, што строгі следчы яна толькі на рабоце: прафесія патрабуе — ты нясеш велізарную адказнасць за лёсы людзей. Але за межамі працоўнага кабінета яна вельмі жыццярадасны чалавек.

Алена замужам. Цікавімся: напэўна, абранніку было няпроста заваяваць яе сімпатыю?

— Мне патрэбны нейкі час, каб больш даведацца пра чалавека і пачаць давяраць яму. Гэта датычыцца не толькі сямейных адносін.

— Навыкі следчага ў сямейным жыцці спатрэбіліся?

— Пытанняў да мужа ў мяне не ўзнікае. Спадзяюся, і не давядзецца нічога расследаваць, — усміхаецца.

— Хто ў пары галоўны?

— У нас раўнапраўе. Я за дэмакратыю ў адносінах. Але жанчына павінна сумяшчаць у сабе і строгага следчага, і гаспадыню, і маму. У яе шмат прафесій, акрамя яе асноўнай работы.

— На вашу думку, што важна для сучаснай жанчыны?

— Стабільнасць, клопат і ўвага блізкіх, усведамленне таго, што шчаслівыя яна і яе родныя. А яшчэ важна быць задаволенай тым, кім ты з'яўляешся на гэты момант.

«Стыль ваджэння не залежыць ад полу»

— Марыначка, не спяшайся. Ты павінна адзін раз павольна крануцца з месца, а не тры хутка заглухнуць. Малайчына.

Так **інструктар і дырэктар мінскай аўташколы «Элегія» Алена БАСЯКОВА** падбадзёрвае сваіх курсантаў. Сама яна за рулём 15 гадоў.

— Не ўяўляю, як у вялікім горадзе можна абысціся без машыны. Асабліва, калі ў цябе маленькія дзеці. Таму я, яшчэ будучы цяжарнай, села за руль. Аўтамабіль — гэта не раскоша, а зручнасць і неабходнасць, — лічыць Алена.

Інструктарам яна стала пяць гадоў таму. Дагэтуль працавала ў дзіцячым садку і прызнаецца, што гэта была самая цяжкая работа ў яе жыцці. Адказнасць вялікая, а заробкі маленькія. Трэба было думаць, як круціцца, вось і пайшла вучыць ваджэнню. Па дыпломе Алена педагог і лічыць, што кожнаму інструктару варта было б мець такую адукацыю: усё ж такі ў школе працуюць.

Чым жанчыны-інструктары адрозніваюцца ад мужчын? «Спакоем, — адказвае гераіня. — Мы ніколі не крычым на сваіх курсантаў, а тлумачым. Дзяўчына, якая прыйшла да мяне пасля іншай аўташколы, сказала, што там ішла на кожны занятак, як на выпрабаванне. Крычаць бессэнсоўна: у чалавека толькі блакіруецца мозг, ён ужо ад страху нічога не чуе. Так можна адбіць ахвоту сядаць за руль наогул».

А вось стыль ваджэння, на думку Алены, хутчэй залежыць ад тэмпераменту, а не ад полу. У спартсменаў і танцораў ён больш агрэсіўны і смелы, у гуманітарыяў — асцярожны.

— У мяне былі бландзінкі сярод курсантак, што першыя стартавалі на святлафоры. Мужчыны заглядваліся! — усміхаецца жанчына.

Мы едзем разам з ёй у машыне, калі перад намі няправільна перастройваецца іншае аўто. «БМВ — гэта асаблівы від кіроўцаў, — заўважае Алена. — Я трымаюся ад іх на вялікай адлегласці, бо адтуль часта можна пачуць негатыў у бок жанчын за рулём. Але ведаеце, як ёгі кажуць? Калі чалавек на цябе злуецца, ён аддае табе сваю энергію. Таму я адчуваю сябе цудоўна: мне за дзень столькі энергіі пасылаецца *(смяецца)*! Увогуле, калі чалавек на дарозе хам, не паважае жанчыну, ён і ў сям'і так сябе паводзіць».

Алена ўспамінае, што спачатку да яе аўташколы (а там усе інструктары — прадстаўніцы прыгожага полу) ставіліся скептычна, нават супрацоўнікі ДАІ. А цяпер адчуваюць з яе боку канкурэнцыю. Тым больш што мужчыны на курсы да жанчын таксама запісваюцца.

— Мне не складана было прабівацца ў гэтай сферы, — дзеліцца суразмоўніца. — У мяне характар мужчынскі. Мая мама — вельмі моцная жанчына. Напэўна, гэта перадалося. Я яшчэ па гараскопе Казярог, таму заўсёды дабіваюся свайго. Нічога не кідаю на паўшляху, як бы цяжка ні было.

Алена — мама дваіх дзяцей. Калі цікавімся, да каго яны пойдуць вучыцца ваджэнню, адказвае, не вагаючыся: да яе. «Каму ж я іх даверу? Хоць інструктары-мужчыны ніколі не вучаць сваіх жонак. Гэтак можна давесці шлюб да разводу».

— Які для вас самы лепшы падарунак на 8 Сакавіка?

— Мне шмат чаго патрэбна. Партатыўны прыпальвальнік акумулятара, аўтамабільны кампрэсар... Як нестандартная прафесія, так і нестандартныя падарункі *(усміхаецца)*. Муж у мяне слесар. У яго руках — усе машыны аўташколы. Калі ён падрамантуе іх, гэта таксама будзе падарункам.

— Якой мусіць быць сучасная жанчына?

— *(Задумваецца)* Слабай. Бо гэтага стала не хапаць нашым мужчынам — мы так імкнёмся да самастойнасці. Я не феміністка зусім. Не буду казаць, што жанчыны павінны быць ва ўсіх прафесіях, лічу, што ёсць чыста мужчынскія спецыяльнасці. Калі б у мяне была магчымасць сядзець дома і муж даваў столькі грошай, колькі трэба, я б, напэўна, пагадзілася быць хатняй гаспадыняй. Занялася б больш сабой, дзецьмі. Можа, яны б лепш вучыцца сталі *(смяецца)*. Хоць у жанчын такі характар — нам ніколі не бывае дастаткова. Нават калі нас асыпаць золатам, нам стане сумна і мы пойдзем «у народ».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

БПС-СБЕРБАНК

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СНЕЖНЫЙ КВЕСТ ОТ СБЕРБАНКА»

Организатор рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак». УНП 192325716, 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, 3-й этаж.

Наименование рекламной игры: «Снежный квест от Сбербанка».

Территория проведения: Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры: игра проводится с 5 января 2018 года по 20 марта 2018 года.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь (свидетельство о государственной регистрации № 3185 от 27 декабря 2017 года).

Сведения о количестве участников рекламной игры: в игре приняли участие 424 (четыреста двадцать четыре) человека.

Сведения о розыгрыше призового фонда: призовой фонд (11 призов), общий размер которого составляет 20 549 (двадцать тысяч пятьсот сорок девять) белорусских рублей 26 копеек, разыгран полностью.

Список победителей розыгрыша

Приз – Робот пылесос IBOTO 710 стоимостью 550,00 бел. руб. + денежная сумма в размере 65,60 бел. руб.

1. Колосовский Вячеслав Арнольдович, г. Минск.
2. Толох Светлана Анатольевна, г. Барановичи.
3. Король Дмитрий Васильевич, д. Галево.
4. Прохорчик Ирина Владимировна, г. Минск.
5. Каплунова Екатерина Ивановна, г. Светлогорск.

Приз – Интеллектуальные часы Samsung Galaxy Gear S3 Classic/SM-R770 серебристый стоимостью 844,20 бел. руб. + денежная сумма в размере 109,56 бел. руб.

1. Соловьева Наталья Геннадьевна, пос. Юбилейный.
2. Литвинов Вадим Викторович, г. Могилев.
3. Фролова Светлана Викторовна, г. Гомель.
4. Дудинский Сергей Степанович, г. Гродно.
5. Князев Геннадий Алексеевич, г. Брест.

Главный приз – Подарочный сертификат на тур «Швейцарские Альпы» (7 дней, 6 ночей, 2 человека) номиналом 8080 рублей + денежный приз 3000 рублей + денежная сумма в размере 1622,46 бел. руб.

Стаброник Василий Иванович, г. Минск.

Поздравляем победителей!

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры 8 (029) 385-51-10

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
Государственное производственное объединение «Минскстрой»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

Режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00 до 14.00.

Тел.: 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

– ул. Щорса, д. 1 – 41 мес., ул. Налибокская, д. 34 – 20 мес., ул. Одинцова, д. 54 – 13 мес., ул. Г. Ширмы, д. 7 – 18 мес., пр-т Газеты «Правда», д. 1 – 15 мес., ул. Одинцова, д. 56 – 13 мес., ул. Горецкого, д. 36 – 13 мес., ул. Академика Высоцкого, д. 3 – 9, 8 мес., ул. Героев 120-й Дивизии, 2 – 23,9 мес., ул. Пономарева, 9А – 22 мес.

Объединение осуществляет строительство объекта «Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилой дом № 32 по генплану.

Свидетельство (удостоверение) № 500/938-5799 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 24 октября 2016 года.

Земельный участок площадью 0,1645 га.

Проектом предусмотрено строительство односекционного 19-этажного 132-квартирного жилого дома в конструкциях серии М111-90 с техническим подпольем и теплым чердаком.

Начало строительства жилого дома – 26 июля 2017 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – июнь 2018 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение от 04.08.2015 № 374-15/15, дополнение к заключению от 12.01.2017 № 675-15/16).

Договор строительного подряда от 04.07.2017 № 205с-07-17, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить, на строительство квартир:

– однокомнатные №№ 8, 10, 12, 15, 17, 19, 22, 24, 26, 29, 31, 33;

– двухкомнатные №№ 7, 9, 11, 14, 16, 18, 21, 23, 25, 28, 30, 32;

– трехкомнатные №№ 13, 20, 27, 34.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

2 050 руб. – для 1-комнатных, 2-комнатных и 3-комнатных квартир, расположенных на 2–5-м этажах, при условии оплаты согласно графику платежей.

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 30 % от стоимости квартиры, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 5 (пяти) банковских дней со дня регистрации в Мингорисполкоме договора создания объекта долевого строительства.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Заместитель генерального директора А. В.Черников

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторных электронных торгов со снижением цены по продаже гаража, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Платонова, д. 12Е, пом. 62

Лот № 010318001. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-27258 (гараж с подвалом в ГК «Мукомольный-12»). Общая площадь – 39,2 кв. м. Г. п. – 1993. **Начальная цена продажи, бел. руб. –** 10 287,00. **Задаток, бел. руб.** – 1028,00. **Шаг – 5 %**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ: изолированное помещение с инв. № 500/D-27258 расположено в капитальном строении с инв. № 500/С-1184, под обслуживание которого выделен земельный участок площадью 0,2902 га с кадастровым номером 500000000009002632. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для обслуживания гаражей на 62 машиноместа по ул. Платонова. 12Е. Право временного пользования

ОБРЕМЕНЕНИЕ: арест. Постановление следователя (КГБ Республики Беларусь) от 02.08.2008 № 6/н. Постановление о наложении ареста на имущество

УСЛОВИЯ

1. Победитель электронных торгов либо в случае, если электронные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в электронных торгах подано только одним участником, и он согласен приобрести Предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного Предмета электронных торгов не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента утверждения протокола электронных торгов.
Указанный срок перечисления денежных средств Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен подразделением Департамента, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента утверждения протокола о результатах электронных торгов. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом электронных торгов.
3. Переход права собственности на приобретенный на электронных торгах Объект недвижимости (имущество, обращенное в доход государства) осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов

Дата и время начала проведения повторных электронных торгов – 30 марта 2018 в 10.00 (по времени на сервере ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 608 от 12 июля 2013 г., с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63 «О совершенствовании работы с имуществом, изъятым, арестованным или обращенным в доход государства».
Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: республиканское унитарное предприятие «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.
Электронный адрес ЭТП: http://торги.бел
Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже имущества (гараж с подвалом, лот № 010318001), проводимых 30 марта 2018 г. (Партизанский МРО). Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 27.03.2018 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметом электронных торгов. **Контактное лицо для осмотра Предмета:** Степанюк Олег Олегович, тел. 8 (044) 529-25-96

Организатор электронных торгов: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: tb@ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский шпалопропиточный завод» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **станка долбежного ГД-320 (инв. № по бух. учету 041196) 2006 г. в., суммарная мощность электродвигателя 13,32 кВт, размер 2850х2160х3010, масса 5660 кг. Находится в нерабочем состоянии (долбяк демонтирован, требует замены или кап. ремонта).**

Начальная цена с НДС (20 %) – 5 062,98 бел. руб. Стоимость снижена на 70,0 %. Задаток 10 % от начальной цены – (506,30 бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 20.01.2017, 30.05.2017, и 23.11.2017. Аукцион состоится **21.03.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.03.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Уважаемые акционеры ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»
30 марта 2018 года состоится годовое общее собрание акционеров Открытого акционерного общества «Пищевой комбинат «Веселово»

Место нахождения: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, д. 24.

Собрание пройдет по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, д. 24, актовый зал.

Повестка дня собрания

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» за 2017 год и основных направлениях деятельности Общества на 2018 год.
2. Отчет Наблюдательного совета ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» о проделанной работе в 2017 году.
3. Отчет ревизионной комиссии ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» о работе в 2017 году.

Ознакомление акционеров Общества с заключением ревизионной комиссии по результатам проведения ежегодной ревизии за 2017 год.

Ознакомление акционеров Общества с аудиторским заключением, подготовленным по результатам проведения аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2017 год.

4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности и распределения прибыли и убытков Общества за 2017 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли Общества за 2017 год. О выплате дивидендов за 2017 год.
6. О направлении использования чистой прибыли Общества на 2018 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета Общества.
8. Об избрании ревизионной комиссии Общества.
9. О размерах вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
10. Об утверждении локальных нормативных правовых актов Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, д. 24, кабинет юриста, с 21 по 29 марта 2018 года с 9.00 до 16.00 либо 30 марта 2018 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 30 марта 2018 года, 14.00.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2018 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру общества (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером – документ, подтверждающий его должностное положение и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 690277551

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Рубежевичи» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания бани, инв. № 622/С-45990 общей площадью 152,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625484806101000178 площадью 0,0847 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, д. Н. Рубежевичи, ул. Лесная, д. 1А (далее – Объект).** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона рек и водоемов (ручей № 2, р. Сула), пл. 0,0847 га; прибрежная полоса ручья № 2, пл. 0,0040 га; охранная зона электросетей напряжением до 1000 Вт., пл. 0,0019 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, пл. 0,0018 га).*

Условия продажи:

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

Начальная цена объекта с НДС (20 %) – 15 106,30 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (1 510,00 бел. руб.), перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.11.2017. Аукцион состоится **21.03.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.03.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

ООО «Юридическая компания Аспект» проводит повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «МОДЕРАТО», находящегося в процедуре ликвидации

№ лота	Наименование лота	Начальная цена за лот, руб.	Шаг торгов, руб.	Задаток для участия в торгах, руб.
1	Грузовой автомобиль МАЗ 5337 1989 г. в., шасси	4 000,00	200,00	400,00
2	Компрессор ПВ-10 на шасси МАЗ 8925 1989 г. в.	6 500,00	325,00	650,00

*Торги состоятся **22.03.2018 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Панфилова, д. 2, пом. 49, оф. 6 (левое крыло, минус 1 этаж). Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **19.03.2018 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту их проведения*

Продавец	ООО «МОДЕРАТО»
Организатор торгов	**ООО «Юридическая компания Аспект»**
Реквизиты для оплаты задатка	**Бенефициар – ООО «МОДЕРАТО», г. Минск, ул. Восточная, 129, оф. 308, счет в BYN № BY05BLBB30120100159037001001, в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 100159037**

Условия торгов:

к участию в торгах (аукционе) допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;
лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка, а также документы, предусмотренные п. 12 пост-я Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица»;
победителем торгов признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;
договор купли-продажи подлежит заключению в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;
победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;
в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, подписания договора, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;
в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;
победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает цену лота **без учета НДС 20 %** (продавец не является плательщиком НДС) за вычетом суммы внесенного задатка в течение 5 (пяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи, если иной срок для оплаты не определен соглашением сторон

Предыдущее извещение о торгах опубликовано в газете «Звязда» за 28.09.2017 г.

Получить дополнительную информацию о порядке проведения аукциона можно по телефонам: +375 (44) 598-66-27, 8 (017) 348-06-99

Жменька слоў. І... цэлы раман

Вядомая беларуская пісьменніца Лідзія Арабей (светлай памяці) за свае амаль 90 і пабачыла, і напісала шмат.
Казала неяк, што родзіч званіў — пад уражаннем ад яе «Паласы дажджу». «А гэта пра што?» — паспрабавала ўспомніць Лідзія Львоўна (бо калі тое было). — «А вы пачытайце, — «падказаў» сваяк. — Гэта вельмі цікава!»
Не ў памяці, ці засела за тую «Паласу...» шаноўная аўтарка. А вось я свае зборнікі абразкоў «Праз каханне», «Каб сказаць... І пачулі» надоечы пагартала. Цікава было, асабліва — пра нас, пра жанчын.

ТОЛЬКІ ПРАЎДУ...

«З чаго пачынаецца ваш дзень?» — любяць пытаць журналісты ў палітыкаў ды зорак эстрады.

Адна з іх (мы гадоў 20 знаёмыя) адказвала так: «З кубачка кавы і цыгарэты». Што, між іншым, чыстая праўда. Але...

Кажу, што ведаю: жыве гэта зорачка ў звычайным панэльным доме. Жыве з дачкою і зяцем. Яны цяпер малое чакаюць. І курыць у хаце... Ды божа барані!

Таму цешча, прадраўшы вочы і ўскінуўшы на плечы халат, паўзе на кухню і ўжо з яе — на лесвічную пляцоўку, у ціхі куток, дзе смецяправод. На суседчыну скрынку з бульбай яна ставіць попельніцу і кубачак з кавай, на сваю — садзіцца сама, запальвае цыгарэту, пачынае дзень.

...Знаёмы рэдактар некалі казаў: «Народ павінен ведаць праўду! Толькі праўду! Але не ўсю».

ДЗВЕ ДАЧКІ, ДЗВЕ МАЦІ

Сіла слоў, сіла прыкладу... Пятроўна гады тры таму ўсё да капейчыны з «панчохі» выграбла, гараж прадала, сватоў «страсянула», у крэдыты па вушы ўлезла, але кватэру для дзяцей — для дачкі з зяцем, для ўнучкі — пабудавала!..

Што цікава, прыяцелькам, блізкім сваім расказвала потым не столькі пра цяжкасці, колькі пра тое, як яны атрымалі ключы, як першы раз і разам паехалі глядзець тыя апартаменты: кухня 13 квадратаў, калідор — 16... Малая па пакоях адразу панеслася... А вось дачка — наадварот: тут жа, у калідоры, села на падлогу, абхапіла рукамі твар і, не могучы верыць шчасцю, заплакала: «Мама, мамачка... Мы?.. Тут... будзем жыць?!»

Узнагародзіла, карацей, аддзячыла. Яна — сваёй маці. І на гэткі ж подзвіг (у імя дзяцей) падбіла чужую...

Аднак яе дачка, атрымаўшы ключы, у калідоры не спынілася — спакойна, па-гаспадарску прайшлася па кватэры. А прамовіла толькі адно:

— Блін, дзе ж грошы ўзяць, каб гэта абставіць?!

ПА ЗАКОНАХ

Жыццё ў палоску. Суседка па дачы яшчэ ўчора, здаецца, шчаслівай была — хвалілася, якое ўдалае насенне купіла, як хораша ўсё ўзышло. А сёння заміж любасці — злосць.

— Мама «памагла», — абураецца на ўвесь голас. — І прасіла ж яе: «Не ідзі ў гарод. Я сама ўсё прапалю...». Дык жа не — улезла! Агуркі — праз адзін павырывала (ведама, не дабачыць...), а моркву (такая градка была!) — ледзьве не ўсю!

...Закон жыцця: матуля (хай нямоглая, старая) хоча нешта рабіць, хоча дапамагчы дачцэ, бо шкадуе яе.

А дачка — моркву...

Пакуль маці жывая.

ЖАХ

Вёска. Крамка. Міні-мітынг. У сэнсе, тры кабеткі сышліся, гавораць пра мужоў — і, між іншым, нічога ўсцешнага, бо ў адной ён горкі п'яніца, у другой — «яшчэ той кішкамот»...

— От Соньцы добра! — зайздросцяць абедзве трэцяй. — Ніхто галаву ёй не дурыць, ніхто яе кроўку не п'е — адна! Сама сабе начальніца, што хоча, тое і робіць.

Сонька ўсміхаецца, Сонька — не пярэчыць, яна нават згаджаецца, калі кажа ім:

— Ну, мне найлепей, «што хачу, тое і раблю»: стану плот гарадзіць — есці не варана, стану есці варыць — плот не гароджаны...

І нават паскардзіцца на гэта няма каму.

«МЫ ВСЕ УЧИЛИСЬ...»

Антонаўне гадоў пад 40, відаць... І «ўсё пры ёй», а не замужам — нават не была... Чаму — пытацца нявёмка. А здагадвацца...

Фаіна Ранеўская ў старасці і, відаць, напаўжартам расказвала, як першы раз закахалася (у артыста, у свае 19), як пакутавала, як прагна хацела, каб ён заўважыў, звярнуў на яе ўвагу. І як цуд той нарэшце адбыўся.

— Дзетачка, ты ж ля тэатра такой здымаеш? — неяк спытаў каханы. — То вечарам я зайду...

Дзяўчо ад шчасця ледзь не памерла — грошай пазычыла, стол накрыла, а ўжо прыбралася...

Ён прыйшоў — позна, нападпітку і з... іншай жанчынай. Сказаў: «Дзетачка, пагуляй дзе-небудзь пару гадзін».

Так «пераехалі» Фаіну. Легендарную...

І ці толькі яе?

Пытанні «на засыпку», на роздум: калі б ведалі, кім яна стане, можа, не, пераязджалі» б? А калі б не «пераязджалі», то ці стала б яна тым, кім стала?

ДВА ЛЁСЫ...

Аўцюкоўцы (рэха фестываляў) да ўвагі прывычныя: ахвотна пазіруюць перад камерамі, ахвотна адказваюць на любыя пытанні. Тым больш што складанага ў іх нічога. Накшталт... «Калі ж вы ткалі-вышывалі?» — пытаю ў адной аўцючкі. «Па начах ды калі каровак пасціла», — адказвае тая. «А дзе працавалі?» — «На хверме... Усю жысь. І дома... Як вол, бо чацвёра дзетак». — «А ці добры ж мужык?» — «Ды не дай бажок! І піў, і біў, і з хаты выганяў... З дзецьмі ўвесь час у палі ўцякала. Добра, як у стог дзе заб'ёмся, — я іх сабою накрыю... А раз не дагледзела — хлопчык мой ножкі падмарозіў. З фельчаркай ледзь адцерлі. Помніш?» — звяртаецца яна да «хлопчыка».

Той побач стаіць (па камплекцыі — як шафа з антрэсолямі), слухае, згодна ківае. Маці — радуецца, бо такі падняла, нягледзячы ні на што, у людзі вывела — усіх чацвярых, можа ганарыцца цяпер і сабой, і дзецьмі. Аднак... Гэта нявёмка, нясціпла, таму аўцючка «адступаецца»: ужо сама пытае ў пажылой жанчыны, што побач: «А як жа вы?.. У вас колькі дзетак?»

Тая неспадзеўкі губляецца, ды дзявацца няма куды — спакойна адказвае, што замужам не была, дзяцей не мае...

Значыць, не раджала, не няньчылася, не начавала ў стозе, не плакала (ні ад уласнага бяссілля, адціраючы тыя ножкі, ні ад радасці за першыя словы), не перажывала, не пакутавала...

Дзве жанчыны (адна ўсю жыткі білася, як вада ў віры, другая, можна сказаць, стаяла на беразе) — два лёсы.

ФОРМУЛА ЛЮБОВІ

...Сцежкі іх не адразу сышліся: Маша на той час набылася ўдавой, Косця — двойчы жаніўся і двойчы разводзіўся. Але ж пажаніліся, жытло набылі, забралі бацьку яго старэнькага — разам жывуць, хоць гэта і цяжка: не тыя ўжо нервы, не тыя характары. Ён ледзь што — «у бутэльку», яна — таксама: за свае «вандзэлкі»...

Пахапа́ла днямі (чарговы раз), выскачыла на вуліцу да сваёй машыны і, глынуўшы сцюдзёнага паветра, трохі працверазела — ад думак: «А што далей? Куды ісці і ехаць? Дамоў? Дык там жа дачка, зяць... Там (і амаль паўсюль!) сем'і... А ёй, значыць, зноў адной? За якія грахі? Чаму?»

Свёкар следам выйшаў, спытаў:

— Ты куды гэта, донечка? Што надумала? Давай свае сумкі — пойдзем назад... Я зараз свінцы замяшаю, каб табе лягчэй было; па бульбачку ў склеп схаджу...

«Каб табе — лягчэй было»...

Ці не ў гэтым, да болю простым, формула любові?

Чалавеку разам з жыццём Бог дае крыж. Потым — сілы, каб несці. І акружэнне, якое ў цяжкія хвіліны будзе спрыяць, падстаўляць плячо. Альбо... не будзе.

АРЫФМЕТЫКА

«Во, на ўдаву і лапаць брэша!» — уздыхае Наташа і гаворыць пра чарговую крыўду. Мужчына знаёмы ёй з сынам адпачынак абяцаў. Расказаў, якое возера там (тут, у Беларусі), якія сосны, як смачна гатуюць... А галоўнае — нядорага. Ён усё абяцаў уладзіць, нават аплаціць!

Яна з той радасці дзве вуды малому купіла:

— Паверыла... Дурніца!

— Не, ты проста маладая, — па-старэчы ўздыхаю я і расказваю любімую байку пра дзвюх жанчын. Яны неяк раз кавалераў да сябе запрашалі. «Так, — гаварыла старэйшая, — клічам 32 чалавекі» — «Божухна, а навошта столькі?» — жахнулася маладая і пачула: «Па-першае, з 32 — 16 не прыйдзе, з 16 — 8 прысунуцца п'янымі, з 8 — 4 (потым акажацца) ужо не мужчыны, а па два...»

Наташа смяецца і, запамінаючы, загінае пальцы:

— Як-як? 16 не прыйдзе?..

Хто папярэджаны — той узброены. Хоць бы псіхалагічна.

КАБ ЗРАЗУМЕЛІ

Сяброўкі завуць яе Птушкай. Відаць, таму, што яна заўсёды ў «палёце», заўсёды ў клопатах — пра матулю, дачку, унучку, пра чужых дзяцей з гарадскога хоспіса, пра знаёмых, незнаёмых і толькі потым ужо — пра сябе...

Зрэшты, зараз гэты клопат ці не самы галоўны, бо яна шукае... працу — новую.

Галоўнае, старую сваю Птушка любіла і добра ведала, яна хацела і магла працаваць. Але...

Гэта некалі ніхто не глядзеў на ўзрост: працуеш — працуй! Хоць у 90, калі спраўляешся. А потым — за абнаўленне кадраў узяліся, кантракты ўвялі.

...Тым, хто гэта зрабіў, Птушка спачатку зычыла шмат чаго. Цяпер — хіба таго, што мае сама. Гэта значыць, каб ім таксама без дай прычыны не падпісалі кантракты; каб «пасадзілі» (як большасць) на, мякка кажучы, сціплыя пенсіі; каб на тыя грошы ды ў горадзе яны паспрабавалі «пражыць» і, калі гэта не атрымаецца, пашукаць працу. А галоўнае, каб ім тады (з іх адукацыяй і працоўным досведам) таксама прапанавалі — у лепшым выпадку — «пасады» падмятайлаў ці фасоўшчыкаў круп.

ЖМЕНЬКАЙ СЛОЎ

Мужчына...

Падалося, прыстойны?

Падалося, разумны?

Падалося, добры?

Падалося, звярнуў увагу?!

Паглядзела бліжэй — падалося.

МАРЫЦЬ НЕ ШКОДНА

У Кацюшы — папугай. Не звычайны, бо гаворыць, і, дарэчы, не абы-што. Ну вось напрыклад, сабрала Каця сняданак, папугай вокам кінуў і кажа: «Шык-коўна!», стала адзявацца-раздзявацца, ён зноў тут як тут: «Шык-коўна! Шык-коўна!»

Божухна, калі б кожнай з нашых жанчын хоць адзін раз на дні хтось казаў гэта слова...

Ці трэба пісаць, што яны зрабілі б?

ПА ДАРОЗЕ

Штодзённае, жаночае — нешта прыгатаваць, памыць, прыбраць, купіць... Шматлікія «трэба»: дома — адны, на працы — другія...

І толькі па дарозе — з дому на працу і з працы дамоў — можна «адарвацца»: калі пашанцуе — сесці, дастаць з сумкі кніжку, газету і пачытаць.

Альбо (калі сесці не пашанцуе) — паглядзець, як сплывае апошні снег, як вяртаюцца ў гнёзды птушкі, як прыгожа апранаюцца (ці распранаюцца?) дзяўчаты, як прыходзіць на зямлю вясна і праходзіць жыццё...

Незалежна — бачыш ты гэта ці не.

Валянціна ДОЎНАР.

P. S. ...Настаўніца спытала ў дзяцей: «Што вы дорыце сваім любімым 8 Сакавіка?» — «Кветкі! Малюнкі! Цукеркі!» — зашумелі вучні. «А можна і песню... — дадаў адзін, — калі больш няма чаго».

У мяне — ёсць. Верш:

Кожны ранак ёсць прычына
Дыфірамбы пець жанчынам
І прасіць іх, дарагіх,
Ад бяды і адзіноты,
Ад нястачы і нудоты
Берагчы найперш малых,
Берагчы сваю Айчыну,
Берагчы свайго мужчыну
І... йшчэ парачку чужых!

Усміхнуліся? Цудоўна! Так і хадзіце! Бо ўсмешка (гэта навукова даказана) ёсць самы лёгкі, самы танны і ўніверсальны спосаб упрыгожыць сябе. І свет.

Перад святамі.

P. P. S. Насамрэч перачытаць што-кольвек з тысяч абразкоў прымусіў тэлефонны званок: спадарыня Амельянюк з Брэста пыталася, ці ёсць у продажы ды бібліятэках згаданыя кнігі? Месцамі — цалкам магчыма — пытайцеся. Чытво, вядома ж, на аматараў, але ім, як падаецца (сам сябе не пахвалі — так і памрэш...), задавальненне гарантаванае.

Дні бягуць, а зіма ўсё ніяк не міне,
У тэатры надвор'я паблыталі дзеі.
Паднялася заслона насустрач вясне —
А на сцэну ізноў прыляцелі завеі.

Слухаць спеў завірухі? Ахвоты няма!
Я на гэту прэм'еру гляджу з недаверам:
Мне зусім не да густу актрыса Зіма
І спектакль пад назвай «Вяртанне Хаўера».

Я ніколі не крыкну ёй «біс!» наўздагон
І не стану ўзносіць «Хаўер» у санетах.
Я хачу, каб пачаўся вясновы сезон
На ўсіх кантынентах замерзлай планеты.

СЯМ'Я — ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ШЧАСЦЕ

ГРАМАДЗЯНСКІ ШЛЮБ: УЗАКОНІЦЬ НЕЛЬГА ЗАБАРАНІЦЬ

У Беларусі моладзь усё часцей выбірае варыянт сям'і без афіцыйнага роспісу ў загсе. Хоць першапачаткова грамадзянскі шлюб азначае менавіта шлюб, зарэгістраваны афіцыйна. Аднак за паўстагоддзя паняцце змяніла свой сэнс з дакладнасцю да наадварот.

— Грамадзянскі шлюб можна назваць распутным сужыццём, а можна — шлюбам без штампа. Так жа гучыць лепш. Праз гэта і адбылася падмена паняццяў, — лічыць **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама.** — Пры гэтым, калі маладыя проста

жывуць разам, жанчына ўсё адно знаходзіцца ў няроўным становішчы. Пасля яна можа захацець роўнасці, а хлопец ужо прывык, што ён галоўны і нічым не звязаны. Тым больш што сучасная моладзь лічыць за лепшае цяпер размяжоўваць паняцці «секс» і «сям'я».

Забараніць ці адмяніць такі шлюб, вядома, немагчыма. Ушчуваць ці пераконваць сужыцеляў — таксама. З аднаго боку, для мужчыны сумеснае жыццё без рэгістрацыі шлюбу выгаднае адсутнасцю афіцыйных абавязкаў перад сваёй выбранніцай. З другога — жанчына, якая, можа, недзе ў душы і цешыць сябе надзеяй на вяселле, пры гэтым таксама займае пазіцыю: я будую кар'еру, а не сяджу на гаспадарцы! З трэцяга — абодва яны застаюцца аднолькава неабароненымі, калі ўздымаюцца пытанні афіцыйнай прыналежнасці агульна нажытай маёмасці, дзяцей, спадчыны...

— Хоць грамадзянскі шлюб — гэта існуючая рэальнасць, ад якой нікуды не дзецца, нельга забывацца, што ў ім няма ніякай юрыдычнай абароны для абодвух бакоў. Адсюль і ўсе праблемы, — упэўнена **Ірына ШЭЛЕГ, адвакат адвакацкага бюро «Тэра кансалт» Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, медыятар.** —

Наспеў час падумаць, як на дзяржаўным узроўні забяспечыць нейкую юрыдычную абарону адносінам па-за межамі шлюбу. З часам усё адно прыйдзецца неяк узаконьваць гэтую з'яву. Людзі пачынаюць адносіны, нараджаюць дзяцей: жанчыны сядзяць дома і глядзяць малых, мужчыны працуюць, яны разам набываюць маёмасць....

Нашы суседзі-расіяне, між іншым, ужо прапанавалі ў якасці адной з паправак у Сямейны кодэкс магчымасць прыраўноўваць сумеснае пражыванне на працягу пяці гадоў і наяўнасць агульнага дзіцяці да шлюбных адносін.

Тым не менш нават грамадзянскія шлюбы можна зрабіць моцнымі і адказнымі, калі з самага нараджэння немаўляці выхоўваць у яго эмацыянальную сферу, эмацыянальны мозг, а не толькі рацыянальнае стаўленне да жыцця. Вучыць узаемадзейнічаць, разумець адно аднаго, паважаць, размаўляць проста жыццёва неабходна. У сям'і гэтаму не вучацца, і школа таксама не вучыць. Няма прадмета, які б з маленства рыхтаваў дзяцей да будучага сямейнага жыцця ў сферы ўзаемаадносін паміж мужчынам і жанчынай. Зніклі ўрокі этыкі і псіхалогіі сямейнага жыцця, разважае Зінаіда Вараб'ёва:

— Дзяржаве жыццёва неабходная структура, якая б займалася непасрэдна сямейнымі пытаннямі ад нараджэння чалавека да пахавання. Пры службе сацыяльнай абароны карысна стварыць дэпартамент сям'і, дзе аб'яднаць усіх спецыялістаў, якія павінны працаваць з сям'ёй: сацыяльных педагогаў, псіхолагаў, органы апекі і іншых. А ў нас усё раскідана. Сацыяльная абарона сабе, медыцына — сабе, адукацыя — увогуле за ўсё ў адказе.

РАЗВОД. ГАНЬБА ЦІ ЭВАЛЮЦЫЯ

Умовы заключэння шлюбу ў Беларусі з цягам часу настолькі спрасціліся, што, здаецца, больш ужо няма куды. Адменена прывязка роспісу да месца жыхарства — заяву можна падаваць у любы загс ці нават заказваць яго супрацоўніка на правядзенне цырымоніі ў пэўным месцы: установах культуры, помніках архітэктуры, іншых, спецыяльна адаптаваных для ўрачыстасцяў памяшканнях. Трохмесячны тэрмін «на роздум» таксама кануў у Лету. Ён цяпер скарочаны да трох дзён. А пры асаблівых абставінах, напрыклад пры пагрозе жыццю, — нават у дзень падачы заявы.

— Узрост першага заключэння шлюбу ў Беларусі павялічваецца. Раней жаніліся ў 20—22 гады, цяпер — у 25—27 і ажно ў 29-30. Гэта тэндэнцыя кажа пра тое, што мы рэгіструем ужо гатовыя сем'і, калі людзі жывуць разам не адзін год, а часта ўжо маюць дзяцей, — акрэсліла становішча **Жанна ЗАХАРАВА, начальнік упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — Мы павінны ісці

ў нагу з часам і падстройвацца пад патрабаванні людзей. Няма чаго працівіцца існуючым рэаліям, каб на нас не глядзелі як на архаічных людзей.

Прысутныя аднагалосна згаджаюцца ў тым, што вяртанне да патрыярхальных устояў сям'і ўжо немагчымае, і шлюб не будзе мець такой значнасці, як раней.

— Яшчэ да савецкіх часоў, калі замест рэгістрацыі ў загсе маладыя вянчаліся ў царкве, а бацюшка пасля перыядычна адведваў маладых, адсочваў іх жыццё ды бачыў у царкве, быў пастаянны ўплыў на сям'ю, яе падтрымка. Цяпер такое немагчыма, — лічыць **Наталля ФІЛІМОНАВА, начальнік аддзела ЗАГС Адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска.**

Пэўным чынам «эвалюцыянавала» стаўленне не толькі да шлюбу, а і да яго скасавання. Раней развод лічыўся трагедыяй і ганьбай, а цяпер стварэнне трэцяйчацвёртай сям'і — ледзьве не падстава для гонару, як здаецца на першы погляд.

— Хоць людзі цяпер і не саромеюцца разводаў і нават недзе могуць і пахваліцца сваім трэцім-чацвёртым шлюбам, гэта не значыць, што ў душы яны не перажываюць, што менавіта так складваецца іх лёс, — не па чутках ведае **Вольга АГЕЙКА, дацэнт кафедры псіхалогіі кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат псіхалагічных навук.**

Разам з тым актыўная маладосць з рознымі партнёрамі і чаканне таго самага адзінага сапраўднага мае не толькі псіхалагічныя, але і фізічныя наступствы.

Рэпрадукцыйныя цэнтры ў краіне перапоўненыя, запіс туды на паўгода наперад. Сёння нават маладыя і цалкам здаровыя людзі часам не могуць займець дзіця, кажуць спецыялісты. Медыкі, псіхолагі і валеолагі доўга шукалі прычыну. Аказалася, што на немагчымасць зачацця ўплывае колькасць сексуальных партнёраў. Чым больш іх было ў мужа і жонкі, тым меншая імавернасць, што ў іх будзе дзіця.

— Кожны з партнёраў прыўносіць у мікрафлору арганізма чалавека, з якім мае кантакт, нешта ад свайго цела. У выніку са здароўем, здаецца, усё добра, аднак паміж людзьмі несумяшчальнасць. І прычына яе — блуд, — расказала Вольга Агейка. — Заканамерна, што чым большы ўзрост і больш партнёраў, тым менш шанцаў зацяжарыць. І большая магчымасць нарадзіць хворае дзіця.

МУЖЧЫНСКІ І ЖАНОЧЫ ПОЛЮСЫ

...У сучасным свеце таксама мяняюцца месцамі, упэўнены спецыялісты. Невялікае анкетаванне сярод студэнтаў паказала сумную тэндэнцыю. Матыў выйсці замуж з прычыны кахання 78 % дзяўчат увогуле не выбралі ў якасці варыянта. А хлопцы, наадварот, дэманстравалі большую эмацыянальнасць. Яны ўдвая часцей, чым дзяўчаты, адказвалі, што гатовыя стварыць сям'ю, калі будуць адчуваць, што кахаюць.

— Гэта сведчанне таго, што дзяўчаты пачынаюць па-спажывецку ставіцца да хлопцаў, — абазначыла Вольга Агейка. — Жанчыны больш не хочуць сядзець дома і пячы пірагі. Яны жадаюць быць нароўні з мужчынамі, а часам і вышэй за іх. Але толькі ў асобных пазіцыях, якія выгадныя жанчынам. А па некаторых яны прытрымліваюцца ранейшага меркавання, што мужчына павінен быць галоўны. Гэта зноў жа пазіцыя спажывецкая, а то і праяўленне фемінізму.

Безумоўна, такое становішча не можа не насцярожваць, аднак прычыны для з'яўлення гэтай тэндэнцыі могуць быць розныя.

— Мне здаецца, яна вынікае з таго, што дзеці часта гадуюцца ў няпоўных сем'ях, дзе іх выхоўваюць матуля і бабуля. У выніку мужчыны вырастаюць больш жаноцкімі, а дзяўчаты, бачачы, як маці бярэ на сябе ролю галавы сям'і, — становяцца больш мужнымі і выносліымі, — мяркуе Жанна Захарава.

З іншага боку, нават у поўнай сям'і можна ўбачыць столькі негатыву, што жах. А каб з хлопчыка вырас прыстойны мужчына, жанчына, якая гадуе яго адна, павінна перш за ўсё сама быць асабіста шчаслівая, лічыць кандыдат псіхалагічных навук:

— Калі жанчына на нейкім этапе жыцця будзе адчуваць сваю непаўнавартасць, нерэалізаванасць ці незапатрабаванасць у плане работы, кахання ці пяшчоты, яна зробіць усё, часта падсвядома, каб сын застаўся побач з ёй. У літаратуры гэтая з'ява называецца «феномен бабыля». Менавіта адсюль вынікае мужчынская інфантыльнасць.

Многія праблемы ў сям'і можна было б вырашыць з дапамогай псіхолага. Аднак большасць людзей дагэтуль стэрэатыпна ставіцца да гэтага спецыяліста. Першая рэакцыя на такую прапанову: «Я не хворы!», адзначыла Ірына Шэлег:

— Я сама па большай частцы даведалася, што такое псіхалогія і сутыкнулася з ёю, толькі калі пайшла на медыяцыю. На юрыдычным факультэце ў нас не было ніводнай лекцыі па гэтай дысцыпліне. Мы дагэтуль не ведаем, што такая галіна ведаў можа выкарыстоўвацца ў звычайным жыцці. І матулі, якая засталася адна, неабавязкова самой усё цягнуць на сабе. Звярнуцца да псіхолага, каб ён дапамог ёй калі не знайсці сябе, то хаця б зразумець, што і без мужчыны можна быць задаволенай сваім жыццём. Пра гэта важна гаварыць.

Варта заўважыць, што бясплатную дапамогу сямейнага псіхолага можна атрымаць у Цэнтры дапамогі сям'і і дзецям і дзевяці цэнтрах пры сацыяльна-педагагічных цэнтрах кожнага раёна Мінска. А пры ўсіх паліклініках існуюць кабінеты, дружалюбныя да дзяцей, дзе працуюць дзіцячыя псіхіятры і псіхатэрапеўты.

ЗАМЕЖНАЕ КАХАННЕ І НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Грамадзянскі шлюб, аднаполыя сем'і, пары чайлдфры і іншыя сучасныя выклікі сям'і ў яе класічным разуменні сёння вымушаюць спецыялістаў пэўным чынам падстройвацца пад існуючыя рэаліі. Як, напрыклад, у выпадку з міжнароднымі шлюбамі.

— Калі беларускі рэгіструюць адносіны са сваім выбраннікам за мяжой, ім варта мець на ўвазе, што шлюб будуецца на нацыянальных традыцыях кожнай краіны. Калі ў нас палітыка скіравана на тое, што дзіця перш за ўсё павінна быць з мамай, то ў іншых краінах гэта можа быць зусім не так, — раіць **Марыя ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі.** — Трэба разумець, што, сутыкнуў-

шыся з пэўнымі пытаннямі, напрыклад з тымі ж алімент амі, не заўжды магчыма вырашыць іх без праблем. Калі ў Беларусі ёсць дагавор з краінай, адкуль родам чалавек, з якога мяркуецца атрымліваць аліменты, то ёсць магчымасць абараніць свае правы. Калі не — усё залежыць ад волі замежнай дзяржавы.

З большасцю еўрапейскіх дзяржаў у нашай краіны няма дамоўленасці на спагнанне аліментаў, і яны не пагаджаюцца на заключэнне дагавораў, бо ўдзельнічаюць у шматбаковых міжнародных канвенцыях. Між тым міграцыя ў нас даволі распаўсюджана, і пытанні спагнання аліментаў і іншыя праблемы ўзнікаюць не так рэдка. Каб абараніць правы беларусаў і дзяцей, якія жывуць у краіне, у сакавіку 2017 года Беларусь ратыфікавала Канвенцыю аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых формаў утрымання сям'і. Дакумент уступіць у сілу, як мяркуецца, сёлета ў чэрвені.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Гаворачы пра асаблівасці шлюбаў з замежнікамі, спецыяліст падкрэсліла, што перш за ўсё законы скіраваныя на абарону правоў дзяцей:

— Беларусь — удзельнік Канвенцыі аб правах дзіцяці, дзе гаворыцца, што ў непаўналетняга павінны быць бацькі, месца жыхарства і ў першую чаргу мусяць быць абаронены яго правы. І мы менавіта на гэта звяртаем увагу, а не на абарону правоў мамы ці таты. Існуе таксама Гаагская канвенцыя аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей. Яна таксама грунтуецца на абароне правоў дзіцяці. Увогуле, аб'ект усіх спрэчак — гэта менавіта правы дзіцяці.

ХОЦЬ ЗАМУЖ НЕ ХАДЗІ...

На жаль, пра дзіця, яго думкі і надзеі часта забываюцца людзі, якім перш за ўсё трэба было б кіравацца яго інтарэсамі, — уласна бацькі.

— Руйнуючы адносіны паміж сабой, дарослыя часта не думаюць, што яны турбуюць сваё дзіця. Яно становіцца прадметам таварна-грашовых адносін, і бацькоў не непакояць пачуцці маленькага чалавека, — ацэньвае сітуацыі пры разводах псіхолаг. — Дарослых трэба неяк навучыць азірацца на тое, што яны робяць. Хоць дастукацца да мамы і бацькі падчас скасавання шлюбу амаль немагчыма.

Асабліва калі паміж былымі сужэнцамі крыўда, якая засціць вочы, і адзінае, чаго прагнеш, — любым чынам паболей насаліць былой палове. Напрыклад, праз спагнанне аліментаў.

— Здараецца, што нават у заможных сем'ях спагнанне аліментаў становіцца прынцыповым пытаннем, каб зрабіць на злосць, — сведчыць **Вольга ГРАБОЎСКАЯ, галоўны спецыяліст аддзела**



арганізацыі і прымусовага выканання ўпраўлення прымусовага выканання галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама. — Цяпер памер аліментаў прывязаны да паловы бюджэту пражыткавага мінімуму. А калі жанчына ведае, што былы муж зарабляе больш, чым прапісана афіцыйна, яна хоча атрымаць ад яго яшчэ больш грошай. Пачынае пісаць скаргі, што ён ухіляецца ад выплат. Ён, у сваю чаргу, лічыць, што раз плаціць аліменты, то можа мець больш стасункаў з дзіцем. І нават у другую (новую) сям'ю сваёй былой паловы ўмешваецца. Пры гэтым дзіця пакутуе больш за ўсіх.

Папярэдзіць і вырашыць праблемы, якія могуць здарыцца, калі сям'я раптам перастане існаваць, у пэўнай ступені можа дапамагчы шлюбны дагавор. У гэтым дакуменце можна прапісаць і ўдакладніць абсалютна ўсе моманты, што датычацца сямейнага жыцця, маёмасці і дзяцей. Аднак у Беларусі шлюбны дагавор, як правіла, не складаюць, бо гэта супярэчыць нашаму менталітэту, заўважылі прысутныя. Дамаўляцца пра нешта перад шлюбам лічыцца нечым няправільным. Пры гэтым нават калі такія дакументы рыхтуюцца да шлюбу, яны датычацца перш за ўсё маёмасных адносін, і аніякія пытанні па дзецях там не закранаюцца.

Увогуле шлюбны дагавор, як правіла, складаюць, ужо калі справа пра скасаванне шлюбу знаходзіцца ў судзе. Разам з тым пачынае зараджацца адна цікавая тэндэнцыя, што датычыцца характару шлюбных дагавораў, якія складаюцца да вяселля.

— Літаральна за адзін месяц да мяне прыйшлі два маладыя мужчыны ва ўзросце да 30 гадоў з аднолькавай справай — скласці шлюбны дагавор, — расказала адвакат. — У абодвух у дакуменце былі такія ўмовы, што хоць замуж не хадзі. Абазначаны сумы, якія будучы муж выплаціць за нараджэнне дзіцяці. Дакладна акрэслена, якая і каму належыць маёмасць. Прапісана, колькі выдзяляецца на ўтрыманне жонкі і дзіцяці. У выніку ў будучай сям'і яшчэ да яе стварэння абсалютна адсутнічала паняцце агульнай маёмасці. Усё было падзелена па капейчынах і працэнтах. І такое стаўленне да шлюбу пачынае ўжо перарастаць у тэндэнцыю.

БЕЗ КАХАННЯ НЕМАГЧЫМА ЦЯРПЕЦЬ

Маладыя часта не могуць уявіць сабе, як гэта — пражыць з адным чалавекам усё жыццё?! Сямейныя доўгажыхары кажуць, што ўвесь сакрэт у каханні і цярпенні. Каханне, з якога пачынаюцца адносіны паміж мужчынам і жанчынай, безумоўна, алагічнае пачуццё. Гэта залежнасць аднаго чалавека ад другога. Але менавіта на ім, на каханні, трымаюцца сем'і, якія адзначаюць і сярэбраныя, і залатыя юбілеі. Каханне дапамагае цярпець усе недарэчнасці, хібы і праблемы, што ўзнікаюць на жыццёвым шляху. Калі яно сыходзіць, знікае і цярпенне, бо без кахання цярпець немагчыма, упэўнены спецыялісты.

Летась у краіне загсамі зарэгістравана 66 209 шлюбаў і 8990 разводаў. Калі параўнаць гэтыя лічбы са статыстыкай 2016 года, відаць, што ў краіне на 2600 больш пар вырашылі пажаніцца і на 70 сем'яў менш скасавалі шлюб. Дарэчы, магчыма, праз недахоп цярпення і разбураецца большасць шлюбаў? Асабліва ў першы год жыцця, які супрацоўнікі загсаў лічаць адным з самых складаных перыядаў у жыцці сям'і. «Здараецца, што і праз некалькі дзён пасля вяселля людзі прыносяць заяву на развод, а неяк пара назаўтра пасля заключэння шлюбу прыйшла», — заўважыла Жанна Захарава.

2017 год быў для беларускіх органаў ЗАГС святочным. Яны адзначалі 100-гадовы юбілей. Супрацоўнікі загсаў урачыста праводзілі кожную 100-ю цырымонію заключэння шлюбу, кожную 100-ю рэгістрацыю нематрымоніяльных адносін. Ужо маўляці і іншыя «круглыя» мерапрыемствы. За год беларусы «сыгралі» 647 «залатых» і 577 «сярэбраных» вяселляў, а амаль 40 тысяч новых шлюбаў (каля 60 % ад зарэгістраваных летась) прайшлі пад марш Мендэльсона і іншыя цырыманіяльныя «разынкі».

Урачыста адзначаць у загсе можна не толькі заключэнне шлюбу ды 25 і 50 гадоў сумеснага жыцця. Варта сустракаць з адпаведнай сімволікай і атрыбутамі кожны год сямейнага жыцця, лічаць супрацоўнікі загсаў. Летась, напрыклад, у магілёўскім загсе сужэнцы адзначалі 70 гадоў сумеснага жыцця. Гэта называецца дабрадатнае вяселле. Можаце сабе ўявіць, колькі яны разам!

— Мы прапагандуем сям'ю і яе каштоўнасці, імкнёмся павысіць аўтарытэт сям'і, скіраваць людзей да шлюбу. Таму нашы супрацоўнікі заўжды самі прыдумваюць нешта арыгінальнае для святкавання, хоць гэта і не іх прамы абавязак, — расказала Наталля Філімонава. — Да нас прыходзяць і з унукамі, і з дзецьмі, і нават са сведкамі, якія тады былі на вяселлі. А ёсць тыя, хто толькі парай, удваіх адзначае, і відаць, што ім гэта падабаецца. Нешта незвычайнае робяць і самі сужэнцы. Вось, напрыклад, муж у адной з пар у вершах напісаў гісторыю іх сям'і, і мы паклалі яе ў аснову святкавання. А на ружовым вяселлі (10-гадовы юбілей) неяк сын з букетам руж маме чытаў вершы.

Пагадзіцеся, у якім бы становішчы ні апынуўся чалавек, чым бы ні скончылася яго каханне або сямейнае жыццё, варта ўспрымаць рэальнасць без залішняй злосці ці дарэмных спадзяванняў. На долю сям'і не проста выпадае шмат іспытаў, здараецца, усё жыццё — гэта адно выпрабаванне. Аднак наступным разам, перш чым лаяцца ці скардзіцца, успомніце народную прымаўку «У сям'ю, дзе лад, шчасце дарогу не забывае».

Ірына СІДАРОК.

■ Святочнае

ГАЛОЎНАЯ Ў ЖЫЦЦІ

Яны даюць жыццё, натхняюць на подзвігі, клапоцяцца пра дабрабыт, выхоўваюць дзяцей, самаадданa працуюць дзеля народа і ратуюць лёсы. Жанчыны. Яны заўсёды побач з намі ў самыя шчаслівыя і складаныя моманты. Маці, бабуля, каханая, сястра і сяброўка — хто яна, галоўная жанчына ў вашым жыцці, пра гэта мы спыталіся ў сваіх чытачоў.

Вольга ПАЛІЦІКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

